Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”
Кафедра дашкольнай і пачатковай адукацыі

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА: СІНТАКСІС

***Метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў***

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2021*

УДК 811.161.3’367(076.5)
ББК 81.411.3-22я73
Б43

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 7 ад 29.06.2021.

Складальнік: дацэнт кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Н.В. Крыцкая**

Рэцэнзенты:
загадчык кафедры замежных моў і міжкультурных камунікацый
ВФ УА ФПБ “Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»”,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А.А. Лавіцкі;*
загадчык кафедры музыкі ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт *С.А. Карташоў*

**Б43** **Беларуская мова: сінтаксіс :** метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў / склад. Н.В. Крыцкая. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 52 с.

Метадычныя рэкамендацыі па дысцыпліне “Беларуская мова: сінтаксіс” можна выкарыстоўваць пры правядзенні практычных заняткаў са студэнтамі педагагічнага факультэта спецыяльнасцей 1-01 01 01 Дашкольная адукацыя і 1-01 02 01 Пачатковая адукацыя дзённай і завочнай форм навучання.

**УДК 811.161.3’367(076.5)**
**ББК 81.411.3-22я73**

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021

# УВОДЗІНЫ

Мэта дысцыпліны – садзейнічаць набыццю студэнтамі трывалых і свядомых ведаў па сучаснай беларускай літаратурнай мове для эфектыўнага карыстання беларускай мовай ва ўсіх сферах прафесійнай дзейнасці.

Задачы дысцыпліны:

даць тэарэтычныя веды пра законы і з’явы фанетычнай, лексічнай і граматычнай сістэм сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

спрыяць практычнаму авалоданню нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

выпрацаваць навыкі самастойнага аналізу разнастайных моўных фактаў;

актыўна ўдасканальваць маўленчую практыку студэнтаў, садзейнічаць узбагачэнню іх прафесійнага тэзаўруса;

выхоўваць любоў да мастацкага слова, да духоўнай спадчыны беларускага народа;

развіваць сродкамі мовы інтэлектуальную, эстэтычную, маральную сферы асобы студэнта.

Месца вычэбнай дысцыплыны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй адпаведнага профілю, сувязі з іншымі вычэбнымі прадметамі - “Беларуская мова” з’яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампанента, адносіцца да цыклу спецыяльных дысцыплін і прызначана для падрыхтоўкі спецыялістаў на першай ступені вышэйшай адукацыі. Дадзеная дысцыпліна ўваходзіць у модуль “Тэарэтычныя асновы пачатковай моўнай адукацыі” і звязана з вучэбнымі дысцыплінамі “Руская мова”, “Методыка выкладання беларускай мовы”, “Методыка развіцця маўлення”, “Методыка навучання грамаце і каліграфіі”.

Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

- ✓ аб ролі беларускай мовы ў працэсе станаўлення і развіцця народнасці, нацыі;
- ✓ аб сістэмнай арганізацыі беларускай мовы, яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, граматычным) і іх узаемасувязі;
- ✓ нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

умець:

- ✓ выкарыстоўваць тэарэтычныя веды і рэсурсы беларускай мовы з улікам іх стылістычнай дыферэнцыяцыі ў прафесійнай дзейнасці;
- ✓ рэалізоўваць нарматыўную базу беларускай мовы ў маўленчай дзейнасці;

валодаць:

- ✓ асноўнымі тыпамі вуснага і пісьмовага маўлення;
- ✓ лексічным і граматычным багаццем беларускай мовы;

- ✓ нормамі беларускай літаратурнай мовы.

Выпускнік павінен валодаць наступнымі кампетэнцыямі (у адпаведнасці з адукацыйным стандартам):

УК -1 – ажыццяўляць пошук, аналіз і ацэнку інфармацыі, неабходнай для пастаноўкі і вырашэння задач даследчай дзейнасці

УК-7 – валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму, разумець сацыяльную значнасць будучай прафесійнай дзейнасці

БПК-10 – тлумачыць моўныя факты рускай і беларускай моў, адрозненні фанетычнай, лексічнай і граматычнай сістэм рускай і беларускай моў

СК–3 – выкарыстоўваць магчымасці адукацыйнай асяроддзя для дасягнення асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання і забеспячэння якасці адукацыйнага працэсу

# СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

## Пытанні для самаправеркі

1. Што такое словазлучэнне?
2. Што агульнае паміж словам і словазлучэннем і што адрознівае іх?
3. Якія спалучэнні слоў не з'яўляюцца словазлучэннямі і чаму?
4. На падставе якіх прымет класіфікуюцца словазлучэнні на свабодныя, сінтаксічна непадзельныя і несвабодныя; іменныя (назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя), дзеяслоўныя і прыслоўныя?
5. Якія тыпы сінтаксічных адносін выражаюцца ў словазлучэннях?
6. Якія віды сувязі існуюць паміж кампанентамі словазлучэнняў?
7. Што такое дапасаванне? У чым сутнасць кіравання?
8. Як адрозніць моцнае кіраванне ад слабага?
9. Якімі граматычнымі сродкамі выражаецца сувязь прымыканне?

## *Парадак сінтаксічнага разбору словазлучэння*

1. Выдзеліць словазлучэнне са сказа.
2. Простае ці складанае словазлучэнне.
3. Назваць галоўнае і залежнае словы.
4. Пачатковая форма словазлучэння.
5. Тып словазлучэння паводле выражэння галоўнага і залежнага слоў.
6. Сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння: атрыбутыўныя, аб'ектыўныя, акалічнасныя.
7. Віды сінтаксічнай сувязі: дапасаванне (поўнае ці няпоўнае), кіраванне (прыназоўнікавае, беспрыназоўнікавае, моцнае, слабае), прымыканне.

*Мірна і ціха шапацелі старыя яблыні.*

1. *Старыя яблыні* – словазлучэнне.
2. Простае.
3. Галоўнае слова – назоўнік *яблыні*, залежнае – прыметнік *старыя.*
4. Пачатковая форма – *старая яблыня.*
5. Словазлучэнне іменнае, субстантыўнае з залежным словам прыметнікам.
6. Адносіны паміж словамі атрыбутыўныя: называюць прадмет і яго прымету.
7. Сувязь слоў – дапасаванне, поўнае.

1. *Шасцелі лісцем* – словазлучэнне.
2. Простае.
3. Галоўнае слова – дзеяслоў *шасцелі*, залежнае – назоўнік *лісцем.*
4. Пачатковая форма – *шасцець лісцем.*
5. Словазлучэнне дзеяслоўнае з залежным словам назоўнікам.

6. Адносіны паміж словамі аб’ектыўныя: называюць дзеянне і прадмет.

7. Сувязь слоў – кіраванне, беспрыназоўнікавае, моцнае.

## Практычныя заданні

***1. Вызначце, ці з'яўляюцца наступныя спалучэнні слоў словазлучэннямі. Адказ матывуйце.***

Таму што, важны для нас, стаяў побач, менш за ўсіх, буду маляваць, самы лепшы, побач дарогі, дваццаць сем, для таго каб, лес і поле, за вёскай, мужны чалавек, пяты ад дарогі, вельмі цікавы, згодна з патрабаваннямі, такі рослы, няхай чытае, на працягу дня, найбольш упэўнена, паслухаць бы, будзем думаць.

***2. Пабудуйце простыя словазлучэнні з дадзенымі словамі ў ролі галоўнага і ў ролі залежнага кампанентаў.***

Іншы, восем, смех, крэйда, кніга, кожны, верасень, напісаць, падлога, чыста, лепшы, нешта, ахвота, прачытаць, недалёка, хутка, дваццаць, задача, маленства, чырвоны, прыгажоць, што-небудзь.

***3. Выпішыце з тэксту іменныя словазлучэнні, укажыце від сінтаксічнай сувязі.***

Родная мова ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці. Прыгожае гучанне роднага слова мы пачынаем успрымаць з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, легендаў, паданняў. З роднай мовай мы пакідаем бацькоўскі парог, выпраўляючыся ў далёкія вандраванні. І пачуццё роднай зямлі, якое неяк губляецца, калі ты жывеш на ёй, асабліва абвастраецца, калі апынешся дзесьці далёка. Тады ўспамінаецца кожны куток роднай зямлі, яе людзі, асабліва мілагучнай становіцца мова.

*Паводле В. Старычонка*

***4. Выпішыце з тэксту дзеяслоўныя словазлучэнні, укажыце від сінтаксічнай сувязі. Выпішыце з выдзеленага сказа словазлучэнні, зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

**Пра заснаванне Магілёва і яго назву існуе шмат цікавых легенд і паданняў.** Найболыш пашыраная – пра асілка разбойніка Машэку, які ў далёкай мінуўшчыне гаспадарыў у навакольных дрымучых лясах. Шмат ён бяды чыніў людзям, пакуль не загінуў ад рукі каханай дзяўчыны, ад якой так і не дачакаўся ўзаемнасці. Вялікі курган, насыпаны на магіле разбойніка, людзі назвалі Магілаю Льва. Потым заснавалі паблізу паселішча і далі яму назву Магілёў. Дарэчы, Янка Купала паводле гэтай легенды напісаў паэму «Магіла льва».

Некаторыя гісторыкі звязваюць назву горада над Дняпром з імем галіцкага князя, якога сучаснікі называлі Магутны Леў. Існуе меркаванне,

што менавіта ён у тысяча дзвесце шэсцьдзясят сёмым годзе пабудаваў у сутоку Дняпра і рэчкі Дубравенкі на гары першы драўляны замак. З гэтага ж года Магілёў упершыню ўпамінаецца і ў старадаўніх пісьмовых крыніцах.

*Паводле У. Ягоўдзіка*

**Праверачная работа**

***Выпішыце словазлучэнні, зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

*I варыянт*

Раніцай Яфімка прачнуўся ў прадчуванні шчаслівага дня. Учора ўвечары бацька абяцаў паказаць сакрэты свайго майстэрства.

*II варыянт*

А майстар ён быў вядомы і знакаміты. З усяго Віцебска прыходзілі да яго па гліняны посуд. Нават князь час ад часу прысылаў сваіх слуг выбраць што-небудзь з гатовага посуду ці заказаць новы.

*III варыянт*

Вядома, гліняныя вырабы прыгожыя, але ж і б'юцца хутка. Ніхто не ўмеў так рабіць посуд, як Яфімкаў бацька. Людзі казалі, быццам Бутрым і каваль Ладысь знаюцца з нячысцікам, бо надта многа пашаны ім у горадзе за працу і розум.

*IV варыянт*

Кажуць, што царкоўны звон лечыць душу і цела. Таму і становяцца людзі пад званы, дакранаюцца да іх далонямі і вуснамі. Вераць, што асвечаныя званы ачышчаюць паветра ад інфекцый, супакойваюць буры.

*V варыянт*

Ёсць сведчанне, што дзесяць Мінскіх цэркавак з невялікімі званарнямі ў цяжкі час эпідэмій сваім жыватворным звонам выратавалі горад ад чумы. Аказваецца, званы выпраменьваюць ультрагукавую радыяцыю, здольную знішчаць вірусы.

*VI варыянт*

Нашы продкі не ведалі гэтага, аднак у час эпідэмій званілі ў званы ўдзень і ўначы. Царкоўны звон – гэта малітва. Былі часы, калі са званоў здзекаваліся, як з жывых істот: іх скідвалі са званіц, вырывалі языкі, ганьбуючы, вазілі па вуліцах на вазах, запрэжаных асламі.

# СКАЗ. ТЫПЫ СКАЗАЎ

## Пытанні для самаправеркі

1. Што такое сказ?
2. Якая асноўная функцыя сказа?
3. Якія граматычныя прыметы характарызуюць сказ?
4. Што вы разумееце пад прэдыкатыўнасцю сказа?
5. Што такое мадальнасць сказа і сінтаксічны час?
6. Роля інтанацыі ў сказе?
7. На якія тыпы падзяляюцца сказы паводле мэты выказвання?
8. На якой падставе сказы падзяляюцца на клічныя і няклічныя? Дайце азначэнне клічным сказам.
9. На якія тыпы падзяляюцца сказы паводле структуры?
10. Якія сказы называюцца двухсастаўнымі і якія аднасастаўнымі?
11. Якія сказы называюцца развітымі і якія неразвітымі?
12. Якія сказы называюцца ўскладненымі?
13. Ахарактарызуйце поўныя і няпоўныя сказы.
14. Як размежаваць сінтаксічна падзельныя і сінтаксічна непадзельныя сказы?

## Практычныя заданні

***1. Спішыце тэкст, вызначце тыпы сказаў паводле граматычнай структуры. З выдзеленага сказа выпішыце словазлучэнні, укажыце від сінтаксічнай сувязі, зрабіце сінтаксічны разбор аднаго словазлучэння (на выбар).***

Сонечны летні дзень. **Срэбна-зялёнаю хваляй гайдаецца, шэпчыцца з лагодным ліпеньскім ветрыкам жыта.** А на мяжы поля - блакітныя кропелькі васількоў. Як жа вярнуцца дамоў без букеціка мілых, знаёмых з дзяцінства красак?

У нашы дні васількі, ці валошкі, як іх называюць у некаторых мясцовасцях, сустракаюцца ўсё радзей. Яны даўно залічаны ў шматлікае войска пустазелля. З гэтым войскам людзі змагаюцца штогод, інакш не атрымаць багатага ўраджаю збажыны або карняплодаў. Але не хочацца, каб васількі зусім зніклі з нашых палеткаў...

*Паводле У. Ягоўдзіка*

***2. Спішыце тэкст, вызначце ўскладненыя сказы, у дужках укажыце, чым яны ўскладнены. З выдзеленага сказа выпішыце словазлучэнні, укажыце від сінтаксічнай сувязі, зрабіце сінтаксічны разбор аднаго словазлучэння (на выбар).***

**Дарога павярнула ўлева, шчыльней тулячыся да прыгажуна Нёмана.** Падыходзячы да лесу, той апісваў вельмі зграбную луку́. Яна выглядала старасавецкім садам, у якім замест пладовых дрэў раслі

разложыстыя, дуплястыя дубы, убраныя чорнымі шапкамі буслiвых гнёздаў. Часам гэтыя гнёзды здаваліся нейкімі дзіўнымі падвескамі над дубамі.

Не даходзячы да лукі, выгнуўшыся яшчэ раз каля лесу вельмі прыгожаю дугою, Нёман забіраў управа, пралёгшы бліскучаю стужкаю паміж лугамі і полем. На адным канцы другі стаялі кучаравыя пышныя хвоі, звесіўшы над вадою махрыстыя галіны і аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю карэння. За імі пачыналіся маладыя баравіны, перамешаныя са старым лесам. З зялёнага мора маладога хвойніку то тут, то там высока ўзніміліся парасоны-верхавіны хвой-старадрэвін. Яны, здавалася, аглядалі прасторы сваёй маладой змены, цешачыся і яе размахам, і сакавітай жыццёвасцю. *Паводле Якуба Коласа*

***3. Размяркуйце сказы на простыя і складаныя, падкрэсліце іх граматычную аснову. Вызначце простыя ўскладненыя сказы, у дужках укажыце, чым яны ўскладнены. З выдзеленага сказа выпішыце словазлучэнні, укажыце від сінтаксічнай сувязі, зрабіце сінтаксічны разбор аднаго словазлучэння (на выбар).***

Вёска Мікалаеўшчына на Стаўбцоўшчыне добра вядома ў нашай краіне. Яе ваколіцы – гэта прыгожыя куткі Панямоння, чароўныя і маляўнічыя мясціны. Яны з высокім майстэрствам і любоўю апеты ў многіх творах Якуба Коласа. Тут будучы паэт адчуў веліч і прыгажосць прыроды, навучыўся разумець яе мову.

Кажуць, што для таго, каб зразумець душу народа, трэба пачуць яго песні. А каб зразумець творчасць паэта, неабходна хоць на кароткі час затрымацца на яго радзіме. З Мікалаеўшчынай звязаны многія важныя падзеі ў жыцці народнага песняра. Тут да пачатку Першай сусветнай вайны пэўны час жыў і напісаў шэраг твораў Якуб Колас. Тут адбылася першая сустрэча Якуба Коласа і Янкі Купалы. Таму вырашана было стварыць тут філіял Літаратурнага музея Якуба Коласа. У філіяле музея сабраны пісьмы Якуба Коласа да землякоў, фотаздымкі, цікавыя дакументы, рэдкія выданні твораў, карта коласаўскіх мясцін. Тут прадстаўлены матэрыялы, якія расказваюць пра жыццёвы і творчы шлях паэта.

*Паводле М. Жыгоцкага*

## ДВУХСАСТАЎНЫ СКАЗ. ГАЛОЎНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

### Пытанні для самаправеркі

1. Што такое дзейнік? Якія бываюць дзейнікі паводле структуры?
2. Што такое выказнік? Назавіце тыпы выказнікаў.
3. Чым выражаецца просты дзеяслоўны выказнік?
4. Як утвараецца састаўны дзеяслоўны выказнік?

5. Як утвараецца састаўны іменны выказнік?
6. Калі ставіцца працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам?
7. Якія асаблівасці дапасавання выказніка да дзейніка?

## Практычныя заданні

***1. Запоўніце табліцу сваімі прыкладамі (па 10 прыкладаў у кожны слупок).***

| Просты дзеяслоўны выказнік | Састаўны дзеяслоўны выказнік | Састаўны іменны выказнік |
|---|---|---|
| | | |

***2. Прачытайце тэкст.Зрабіце наступныя заданні:***

***• Падкрэсліце дзейнікі, вызначце іх структурныя тыпы і сродкі граматычнага выражэння.***

***• Падкрэсліце выказнікі, вызначце іх структурныя тыпы і сродкі граматычнага выражэння.***

***• Выпішыце з простага сказа словазлучэнні і зрабіце іх сінтаксічны разбор***

Гэта вялікае шчасце, калі ёсць горад, які чакае цябе, каб затуліць крылом спакою і зрабіць мацнейшым. Горад, чыё імя ты паўтараеш у думках, як імя блізкага чалавека.

Любоў да горада – вялікая таямніца, у якой нялёгка прызнацца. І ўсё ж адважваюся зрабіць гэта. Бо радзільня, дзе я з'явіўся на свет, знаходзілася за сотню крокаў ад Сафійскага сабора. Бо нашай дзіцячай гульнёй былі пошукі падземных хадоў, якія ў старажытнасці выводзілі з сабораў на другі бок Дзвіны. Бо шчодрая рака пасля кожнай паводкі дарыла нам то старадаўнюю манету, то ржавыя жалязякі, якія здаваліся наканечнікамі дзідаў. Бо Дзвіна навучыла мяне плаваць, берагла, калі я, схаваўшы адзенне пад чоўнам, упершыню пераплываў яе. Бо тут, у Полацку, я напісаў свае першыя вершы і апавяданні. Бо і цяпер у Мінску мне часта здаецца: вось падыду да акна, а за ім відаць поўная, як вока, Дзвіна. Полацк – радзіма маёй душы.

*Паводле У. Арлова*

***3. Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце граматычную аснову, вызначце іх сродкі граматычнага выражэння. Знайдзіце простыя ўскладненыя сказы, у дужках укажыце, чым яны ўскладнены. З выдзеленых сказаў выпішыце словазлучэнні, зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

Мінск сталіца Беларусі. Хатынь наш нязгасны боль. Маці гэта галоўны на свеце чалавек. Мір гэта ўзаемапавага і дапамога. Цікавы чалавек гэты Нупрэй. Неба чыстае, васільковае. Сумленне самы вялікі начальнік над чалавекам. Энергетыка аснова сучаснай гаспадаркі. Быць незайздросным не

мецць лішняга клопату. Вочы люстэрка душы. Згода сіла грамады. Звычай няпісаны закон. Сяброўства найдаражэйшы дар. Родная мова наш бестэрміновы пашпарт. Жыццё пражыць не поле перайсці. Свіцязь ціхае, ласкавае возера. Белавежская пушча самы вялікі запаведны лес у Еўропе. Зіма ты чараўніца. Памятаць свой род не быць сіратой. **Балоты вы неацэннае багацце Палесся. Я амаль не студэнт. У нас усе бары і ельнікі музеі славы несмяротнай.**

## ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

### Пытанні для самаправеркі

1. Якую ролю выконваюць даданыя члены сказа?
2. Што называецца дапаўненнем?
3. Чым выражаецца прамое дапаўненне?
4. Чым выражаецца ўскоснае дапаўненне?
5. Што такое азначэнне? Назавіце разнавіднасці азначэнняў.
6. Якімі часцінамі мовы выражаюцца недапасаваныя азначэнні?
7. Што такое прыдатак? Што можа абазначаць прыдатак?
8. Што абазначаюць у сказе акалічнасці?
9. Што абазначаюць і чым выражаюцца акалічнасці кожнай групы па значэнні?

### Практычныя заданні

***1. Спішыце тэкст, падкрэсліце дапаўненні, дайце іх характарыстыку. Знайдзіце простыя ўскладненыя сказы, у дужках укажыце, чым яны ўскладнены. З выдзеленага сказа выпішыце словазлучэнні, зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

У дзівосна прыгожай мясцовасці, у мястэчку Любча Навагрудскага раёна, на высокім беразе Нёмана здаўна ўзносіць у неба свае вежы велічны замак. Адсюль на шмат кіламетраў навокал адкрываюцца дзіўныя абсягі. Унізе, на другім беразе ракі, распасціраецца заліўны луг, што цягнецца аж да самай Налібоцкай пушчы.

**Любчанскі замак быў адной з галоўных рэзідэнцый князёў Радзівілаў.**

Асаблівая значнасць Любчанскага замка была абумоўлена размешчанымі ў яго памяшканнях архівамі і скарбніцай князёў Радзівілаў. Частка скарбніцы стала асновай унікальнага музея – Любчанскай кунсткамеры. У ёй захоўваўся збор карцін і скульптур вядомых майстроў, археалагічныя калекцыі, зброя.

Акрамя кунсткамеры, у Любчанскім замку знаходзіўся адзін з найбагацейшых на той час у Еўропе кнігазбораў. У тутэйшай друкарні выдавалася духоўная і свецкая, навуковая і вучэбная літаратура.

Замак быў разрабаваны, моцна пацярпеў ад дзвюх сусветных войнаў, пачаў разбурацца. Аднак помнік адраджаецца з руін літаральна на вачах. Любоў да роднай зямлі здольная рабіць цуды.

*Паводле Я. Малішэўскага*

***2. З тэкста (практыкаванне 1), выпішыце спачатку дапасаваныя, а потым недапасаваныя азначэнні.***

***3. Спішыце тэкст, падкрэсліце акалічнасці, вызначыце іх разрад паводле значэння. Знайдзіце простыя ўскладненыя сказы, у дужках укажыце, чым яны ўскладнены. З выдзеленага сказа выпішыце словазлучэнні, зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

На бясконцым беразе вялікага шэраблакітнага мора сядзіць хударлявы маленькі хлопчык. З мокрага пяску, які наліпае на далоні, ён будуе вежу. У бясконцым краявідзе будаўнік здаецца маленькім, як кропка ці кропля. **Ён захоплены справай, паглыблены ў яе і не глядзіць на мора.** А там нараджаецца хваля, якая бяжыць з глухім шэптам да берага. Шоргат ракавінак, пяску – і хваля адразу разбівае, руйнуе тое, што хлопчык не паспеў дабудаваць. Перад разгубленым малым застаюцца рэшткі сабора і хваля, якая з шумам спаўзае і сцягвае ў мора плён працы.

Хлопчык пачынае будаваць, працуе хутчэй. Гурба пяску набывае форму. Але зноў набягае хваля і, як коўдра, накрывае сабор з недабудаванай вежай.

Малы ўпарта насыпае, прыгладжвае сцены, вежу, з трэсачак робіць крыжык. Хваля зусім блізка. Чуваць яе шоргат і шэпт. Малы паспявае паставіць крыжык на вежу. Хваля застывае, спыняецца, ссоўваецца ў мора.

Бясконцы краявід. На беразе стаіць сабор з мокрага пяску.

*Паводле У. Сцяпана*

***4. Выпішыце з тэксту простыя сказы. Зрабіце іх разбор па членах сказа.***

Вёска Збляны назаўсёды ўвайшла ў гісторыю нашай Беларусі як радзіма Антона Раманавіча Жэбрака. Сялянскі хлопец вельмі прагнуў вучыцца. А як вядома, хто добрае жаданне мае, таму сам Бог дапамагае. І Антон Жэбрак пасля заканчэння школы паступіў у знакамітую Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева.

Пройдуць гады, і выхадзец з зэльвенскай вёскі Антон Раманавіч Жэбрак стане акадэмікам, прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі. Ён уздымецца на такую вышыню ў навуцы, што з ім будуць лічыцца ўсе генетыкі свету.

А што за навука генетыка? Яна вывучае спадчыну раслін, арганізмаў, паходжанне і змены, якія адбываюцца з імі. Быў час, калі гэту навуку лічылі шкоднай, непатрэбнай. І можаце ўявіць, што перажыў акадэмік генетык Антон Раманавіч Жэбрак.

Навуковыя адкрыцці акадэміка Жэбрака цяпер увасабляюцца ў жыцці яго прадаўжальнікамі. У акадэмічным гарадку ў Мінску стаіць бюст славутага вучонага. У Зэльве ёсць вуліца яго імя.

*Паводле У. Ліпскага*

***Парадак разбору по членах сказа***

1. Галоўныя члены двухсастаўнага сказа (або галоўны член аднасастаўнага сказа):
а) дзейнік, спосаб выражэння яго;
б) выказнік, тып паводле структуры, спосаб выражэння яго;

2. Даданыя члены сказа:
а) дапаўненне, тып;
б) азначэнне (дапасаванае, недапасаванае);
в) прыдатак, яго значэнне;
г) акалічнасць, разрад па значэнні.

*Беларускія бярозы абапал гасцінца калыхалі думкі шумам хлапчуку-ўкраінцу.*

*Бярозы* – дзейнік, выражаны назоўнікам назоўнага склону.
*Калыхалі* – просты дзеяслоўны выказнік.
*Беларускія* – дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам.
*Думкі* – дапаўненне, прыдзеяслоўнае, прамое.
*Шумам* –дапаўненне, прыдзеяслоўнае, ускоснае.
*Хлапчуку* – дапаўненне, прыдзеяслоўнае, ускоснае.
*Украінцу* – прыдатак, указвае на нацыянальнасць.

# АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

## Пытанні для самаправеркі

1. Якія сказы называюцца аднасастаўнымі?
2. Што ляжыць у аснове падзелу аднасастаўных сказаў на дзейнікавыя і выказнікавыя?
3. Назавіце агульнае і рознае ў структуры і семантыцы пэўна-асабовых, няпэўна-асабовых і абагульнена-асабовых сказаў.
4. Якія сказы адносяцца да безасабовых? Якімі формамі выражаецца ў іх выказнік?
5. Па якой прымеце атрымалі сваю назву інфінітыўныя сказы?
6. Якія сказы адносяцца да намінатыўных?
7. Назавіце разнавіднасці намінатыўных сказаў.

## Практычныя заданні

***1. Устанавіце адпаведнасць паміж аднасастаўнымі сказамі і іх тыпамі. Адказ запішыце. Зрабіце іх разбор па членах сказа.***

| | |
|---|---|
| А. Пад вечар пацягнула халадком. | 1. Абагульнена-асабовы |
| Б. Раніцай у Алешніках асвячалі храм. | 2. Назыўны |
| В. Люблю лугі квяцістыя, за полем шумны гай, палеткі залацістыя, цябе, мой родны край. | 3. Пэўна-асабовы |
| Г. Вышэй паднімешся – мацней паб'ешся, як скінешся. | 4. Безасабовы |
| | 5. Няпэўна-асабовы |

***2. Падкрэсліць граматычныя асновы, вызначыць тып аднасастаўнага сказа***

1. Працую, жыву і радуюся за наш вялікі дом.
2. З усмешкаю жыццю глядзім у вочы.
3. Андрэя паклалі ў чацвёртай палаце на першым паверсе.
4. Не за сваю справу не бярыся.
5. Аднекуль дыхнула халодным ветрам.
6. Стала неспакойна на душы.
7. Нешта не спіцца.
8. Вось і фронт.
9. Пад узмахі касы нават і пра непрыемнае думалася лёгка.
10. Дзядзьку Грышу Міхайловіча з горада Полацка я ніколі не бачыў.

***3. Выпішыце граматычную аснову з пэўна-асабовага сказа.***

1) У газеце пісалася аб надвор'і ў наступны месяц

2) Няпраўдай свет пройдзеш, ды назад не вернешся.

3) Назаўтра ўвесь дзень са свірна выдавалі пад канчатковы разлік збожжа.

4) Жытні колас і васілёк на кашулі бацькавай помню.

5) Ноччу збіраліся каля вогнішча, вадзілі карагоды.

***4. Выпішыце граматычную аснову з абагульнена-асабовага сказа.***

1) Над лесам пачынала днець.

2) Табе складаю гэты гімн, мой Мінск!

3) Па-над вёскамі і сёламі свеціць сонейка вясёлае.

4) Рачной мятай, мядовым водарам мурагоў настоена паветра. Хоць бяры ды чай заварвай з гэтага пахучага настою.

5) Зноў хочацца зірнуць на крынічку, з прыемнасцю зачэрпнуць кубкам вады.

***5. Выпішыце аднасастаўны сказ і падкрэсліце яго граматычную аснову.***

1) Не злічыш дароў тваіх, верасень, сёлета!

2) Хмары нізкія, шэрыя.

3) Следам за ім выйшаў паляўнічы.

4) Наш Мінск стаў святочным.

5) Дзецям патрэбна ласка.

***6. Спішыце. У дужках адзначце тып аднасастаўных сказаў і спосаб марфалагічнага выражэння галоўнага члена.***

*1)* Вёска Тугінавічы (К. Цвірка).

*2)* Пастаіш у зацішку і пойдзеш супакоены назад (І. Грамовіч).

*3)* І ўсё навокал ажыло, павесялела (Р. Ігнаценка).

*4)* Дні стаяць ціхія, сонечныя, поўныя мяккай задуменнасці і хараства (Р.Ігнаценка).

*5)* Прыйшла залатая восень! (Р. Ігнаценка).

*6)* Пагляджу ў бязмежны блакіт асенняга неба і раптам успомню былое (Р. Ігнаценка).

*7)* Уздыхну і міжволі задумаюся... (І. Грамовіч).

*8)* Не магу пражыць і дня без успаміну пра лес (Б. Сачанка).

*9)* У сяле збіраюцца, раяцца пра нешта (І. Грамовіч).

*10)* Залатым лесам называлі гэтую мясціну (3. Бяспалы).

*11)* Пахне бензінам, нагрэтым каменем, жалезам і фарбай (Т. Хадкевіч).

*12)* Наш родны беларускі край! (Я. Сіпакоў).

*13)* Вечарамі ў Міканоравай хаце часта меркавалі, як будуць абжывацца (І. Мележ).

*14)* Помню нясмелую красавіцкую зелень рэдкай травы, першы плач кнігаўкі, першую кветку... (В. Адамчык).

*15)* Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі (Прыказка).

*16)* Шчасця за грошы не купіш (Прыказка).

*17)* Не рабі ліхога і не бойся нікога (Прыказка).

*18)* Падымешся, бывала, на світанку, выбежыш за парог... (Я. Пархута).

*19)* Ваўка ногі кормяць (Прыказка).

*20)* Жнівеньскія ночы цёмныя і працяглыя (В. Вольскі).

*21)* А з-пад каменя біў празрысты струменьчык (І. Грамовіч).

*22)* Наш родны беларускі край! Ён прыгожы і па-свойму адметны на поўначы і на поўдні, на ўсходзе і на захадзе (Я. Сіпакоў).

*23)* Усе мы зямляне (Я. Сіпакоў).

*24)* Усё навокал пасвятлела, праяснілася (В. Вольскі).

*25)* Пахне сасной, зямлёй і мокрай ігліцай (І. Пташнікаў).

*26)* Ад фільтраў патыхала гарачынёй... (А. Савіцкі).

*27)* Свет адразу зрабіўся святлейшы (І. Грамовіч).

*28)* Не спалася мне ў той летні адвячорак (Х Лялько).

*29)* Дні стаялі пагодлівыя, сухія (Б. Сачанка).

*30)* Дыхалася вольна, на ўсе грудзі (Б. Сачанка).

*31)* Сонца супакоіць цябе (І. Грамовіч).

*32)* Як слаўна адчуваеш сябе красавіцкім вечарам, стоячы на развілцы палявых дарог і любуючыся з узгорка неабдымным прасторам! (Т. Хадкевіч).

*33)* Яго ні разу яшчэ не пакаралі (З. Бядуля).

*34)* Ад сухой папараці патыхае сухім дрэвам (І. Пташнікаў).

*35)* Сказанага слова да губы не вернеш (Прыказка).

*36)* Незадоўга перад вечарам сабралася на дождж (Т. Хадкевіч).

*37)* Помню вечар, жоўтае святло месяца, шум вады за вёскаю і трэск алешніку (В. Адамчык).

*38)* У сяле збіраюцца, раяцца пра нешта (І. Грамовіч).

*39)* Потым пабудавалі ў мястэчку лесапілку, заводзік, прамкамбінат... (Б. Сачанка).

*40)* Па рэчцы ўгадвалі і надвор'е... (В. Адамчык).

*41)* Хто пытае, той не блудзіць (Прыказка).

*42)* Люблю Пушкіна за яго гордасць, за захаванне чалавечай годнасці, нават у акружэнні прыдворнай камарыллі (Я. Брыль).

*43)* У жніво пахне свежай саломаю і даспелым коласам... (Я. Сіпакоў).

*44)* Выйшлі з лесу, а за ім – лугавіна, за ёю – поле, а ўдалечыні сінее другі лес (А. Бялевіч).

*45)* Стаіш, бывала, над абрывам і не можаш вачэй адвесці ад воднай роўнядзі (М. Ваданосаў).

*46)* На гонары далёка не заедзеш (І. Шамякін).

*47)* Вакол было ціха і цёмна (В. Быкаў).

*48)* Цішэй едзеш – далей будзеш (Прыказка).

*49)* Адвячорак у Трэптаў-парку. Духмяныя ліпы. Таполі нібы салдаты ў ганаровай варце. Веліч смутку і подзвігу (Я. Брыль).

*50)* Мяне адразу пацягнула з хаты: я надта люблю гэтую часіну (І. Грамовіч).

*51)* Спыніцеся, не ідзіце далей у лес і ўслухайцеся (А. Кулакоўскі).

*52)* Пахмурны ранак. Самотны парк (Я. Брыль).

*53)* Зялёны востраў у няспелым жытнім моры. Бярозы (Я. Брыль).

*54)* Задажджыла, як восенню (А. Жук).

*55)* Пабялела. Стала відаць, што лісце на дрэвах у густой расе (А. Кудравец).

*56)* З двара цягнула жывым вясновым марозікам (А. Кудравец).

*57)* Гэта было ў самым пачатку зімы (А. Кудравец).

*58)* Яшчэ доўга помніў я твар таго байца (І. Навуменка).

# СКАЗЫ З АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ

## Пытанні для самаправеркі

1. Назавіце прыметы аднароднасці членаў сказа. Якімі відамі сувязі звязваюцца паміж сабой аднародныя члены сказа?

2. Як вызначыць аднародныя і неаднародныя азначэнні?

3. Назавіце асноўныя правілы ўжывання знакаў прыпынку пры аднародных і неаднародных азначэннях.

4. Калі паміж аднароднымі членамі коска ставіцца, а калі не ставіцца?

5. Якая роля абагульняльных слоў пры аднародных членах?

6. Якія знакі прыпынку ставяцца пры аднародных членах у сказах з абагульняльнымі словамі?

## Практычныя заданні

***1. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.***

Расла ў лесе д…ікая яблынька. Увосень упаў на з…млю з яе кіслы але прыгожы яблык. Птушкі скл…валі і яблык і з…рняткі. Толькі адно зерне схавалася ў з…млю. З яго і вырасла яблынька. Прыйшоў садоўнік і прышчапіў дрэўца. Праз некаторы час зацвіла яблынька пахучымі і духмянымі кветкамі.

Свіцязь – мал..ўнічы куток Беларусі. Паабапал возера растуць дубы і ліпы і вязы і ясені і б…розы. Возера багата рыбай. У ім водзяцца шчупакі акуні л…шчы ліні плоткі карасі і в…лікія язі. Можна тут налавіць і ракаў. У л…сах каля возера вельмі часта сустракаюцца ласі лісіцы вавёркі дзікі зайцы.

***2. Выпішыце сказы з аднароднымі членамі, дзе павінна стаяць коска.***

1. Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы.

2. Вакол лятуць бары, і гоні.

3. Шуміць сасняк, ды бярэзнік голы.

4. Мора – гэта Капітан Нэма і Рабінзон Круза, піраты і людаеды, васьміногі і не адкрытыя яшчэ астравы.

5. На латках і вінаград, і яблыкі, і слівы.

6. Вакол і лес, і хмызнякі, і зялёная дубрава.

7. Першыя мокрыя сняжынкі ўпалі на зямлю.

8. Ні чалавек, ні звер, ні птушка не парушалі яго ранішняга спакою.

9. Праз галлё прабівалася яркае, але ўжо халоднае сонца.

10. Ды ўспомню пажары, і варожыя хмары, і завеі халодных вятроў, і слату, і нягоды, і начныя паходы, і агні партызанскіх кастроў.

***3. Дапоўніце сказы аднароднымі членамі, расстаўляючы знакі прыпынку, пабудаваць схемы сказаў.***

Да Вечнага агню ў святочныя дні прыходзяць … .

Унізе густа разрасліся кусты … .

Кожная пара года па-свойму … .

Сонца было паўсюль: … .

Белае павуцінне лятала ў паветры і чаплялася за … .

У лясах растуць разам … .

Вецер прыносіць у акно аўтобуса пах … .

Пад разлапістымі елкамі выглядалі рознакаляровыя шапкі …

***4. У якіх сказах няправільна расстаўлены знакі прыпынку? Спішыце гэтыя сказы, выпраўляючы памылкі, пабудуйце схемы гтых сказаў.***

а) Недалёка ад нашага дома ёсць возера, і рэчка, і сажалка.

б) Некаторыя птушкі днём спяць а, ноччу палююць.

в) Зімою сонца свеціць, але не грэе.

г) Цяжка зімой знаходзіць ежу, і зайцам, і лісам, і ваўкам.

д) Зубы трэба чысціць і раніцай, і вечарам.

е) У нядзелю бабуля пякла заўсёды смачныя мучныя аладкі, ці дранікі.

***5. Састаўце сказы да дадзеных схем.***

[ О і О ]

[ і О, і О, і О]

[О і О, О і О]

[О, і О, і О, і О]

[О ды О]

[ О і О ды О]

[ О ці О ]

[ ці О, ці О]

[ як О, так і О]

[О або О ]

[ або О, або О ]

[ О, а О ]

[ О, але О ]

[ О, ды О ]

[ ні кала ні двара ]

[ О: О, О, О, О]

[ О, О, О, О - О]

[ О: О, О, О, О - …]

***6. Прачытайце тэкст. Выпішыце сказ, які адпавядае схеме [О і О, О і О]. Знайдзіце сказ з некалькімі радамі аднародных членаў, запішыце схему. Выпішыце сказы, у якіх знакі прыпынку расстаўлены памылкова. Расстаўце знакі прыпынку і запішыце схемы. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленага сказа. Выпішыце з яго словазлучэнне (на выбар) і зрабіце сінтаксічны разбор.***

Наш родны край

Наша Бацькаўшчына, наш родны, беларускі край! Ён прыгожы і па-свойму адметны на поўначы і на поўдні, на ўсходзе, і на захадзе. Ён адметны сваімі рэкамі і азёрамі, лясамі і лугамі. Белавежская пушча і Браслаўскія азёры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач – усё гэта наш родны край.

Спадчына неацэнная і за ўсё даражэйшая. Колькі на душу кожнага з нас прыпадае кветак, дрэў крынічак? Усяго гэтага мы, занятыя вечнымі клопатамі і паўсядзённаю працай, часцей за ўсё не заўважаем. Яно для нас такое ж звыклае, як і паветра, якім мы дыхаем.

Мы звыкла ўсім гэтым карыстаемся і часам нават забываемся, што прырода – не толькі для нас адных… Мы бяром з яе ўсё, чым яна дзеліцца з намі. **Трэба думаць пра будучыню і пакідаць месца ў ёй і рачулцы, і буслу, і травіцы.**

Усё ж мы зямляне, бо зямля ў нас адна, яна агульная для ўсіх. І мы маем радасць суіснаваць на ёй, жыць у дружбе і ва ўзаемнай павазе. Кожны павінен любіць і паважаць свой край.

*Паводле Янкі Сіпакова*

## Праверачная работа

*1. Выпішыце сказы з аднароднымі членамі. Падкрэсліце іх і складзіце схемы.*

а) Вучні дапамагаюць дарослым убіраць ураджай.

б) Вучні дапамагаюць дарослым убіраць буракі, моркву, капусту.

в) Руплівыя пчолы збіраюць мёд.

г) Руплівыя і працавітыя пчолы збіраюць мёд.

д) Сонца свеціць, але не грэе.

*2. Дапоўніце сказы аднароднымі членамі і запішыце іх.*

Вясной прыляцелі гракі, ........

*3. Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце аднародныя члены.*

Асіны бярозы гнуцца пад парывамі ветру сосны елкі грозна шумяць у лесе моцна вецер завывае свішча.

*4. Спішыце, ставячы, дзе трэба, коскі. Абазначце ў першым сказе зверху часціны мовы.Запішыце схемы сказаў.*

Дзень быў цёплы але ветраны. Лес гамоніць і спявае. Таполі і ліпы і клёны ў парку шумяць маладым.

# СКАЗЫ З АДАСОБЛЕНЫМІ ЧЛЕНАМІ

## Пытанні для самаправеркі

1. Назавіце агульныя ўмовы адасаблення даданых членаў сказа. Прывядзіце прыклады.

2. Якія ўмовы адасаблення дапасаваных і недапасаваных азначэнняў і правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры іх?

3. Якія ўмовы адасаблення прыдаткаў і правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры іх?

4. Калі адасабляюцца акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі і адзіночнымі дзеепрыслоўямі?

5. Назавіце выпадкі, калі яны не адасабляюцца.

6. Пры якіх умовах адасабляюцца акалічнасці, выражаныя назоўнікамі з прыназоўнікамі і прыслоўямі?

7. Чым выражаюцца адасобленыя дапаўненні?

8. Якое значэнне маюць далучальныя канструкцыі?

## Практычныя заданні

***1. Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа з адасобленным азначэннем і сказа з аднароднымі членамі.***

Лісіца

За рэчкай на тым беразе падымаючыся ўгару ляжала поле. Вось тут Васько і ўбачыў лісіцу. Яна бегла неяк бокам распушыўшы хвост і нізка прыгнуўшы галаву. Лісіца мышкавала. Было відаць што яе ахапіў паляўнічы азарт. Не прадчуваючы бяды яна набліжалася да рэчкі.

Праз снежныя лапкі хваін Васько добра бачыў лісіцу асветленую сонцам зграбную прывабную ў сваім рыжым уборы. Хлопец пераймаючы палёўку ціхенька піскнуў разы два не зводзячы вачэй з лісіцы. Яна здзіўлена задрала вострую мордачку і раптам сустрэлася чорнымі вачыма з вачыма чалавека замерла з цікавасцю прыглядаючыся да гэтага дзіва. Вочы ў вочы яны глядзелі адно на аднаго некалькі імгненняў – чалавек і звер. Васько трымаў стрэльбу напагатове але забыўся на яе. Лісіца проста па-чалавечы паматала галавой і кінулася ўбок пабегла падмятаючы хвастом парошу і азіраючыся.

## Праверачны тэст

### І варыянт

**1. Адзначце сказы з адасобленымі членамі**

а) Дыхнуў густы цёплы ветрык.

б) Дыхнуў ветрык густы цёплы.

в) На лісці мокрым ад расы зазіхацелі ранішнія прамяні.

г) Дрэмлюць зачараваныя марознай цішынёй векавыя сосны.

д) Дрэмлюць векавыя сосны зачараваныя марознай цішынёй.

**2. Адзначце сказы, у якіх адасобленыя прыдаткі не выдзелены коскамі:**

а) Сама дарога, стары гасцінец, была абсаджана ліпамі, клёнамі.

б) У калідоры яго сустрэла Наташа сястра.

в) На вайне Сяргей артылерыст-зянітчык праявіў мужнасць і адвагу.

г) Як урач забараняю вам начную работу.

д) Як не славіць песняй Беларусь, рэспубліку маю!

**3. Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі:**

а) Высока ў небе, гойдаючы кучаравымі шапкамі, гаманілі тонкія сасонкі.

б) Захоплены думкамі, Максім не адразу заўважыў, што коні чамусьці прыцішылі хаду.

в) Ён, задаволены, усміхаецца.

г) Салавей, пясняр крылаты, прыляцеў вясной дахаты.

**4. Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі:**

а) Ліда, як сакратар камісіі, першая села за стол.

б) Танкіст, адчыніўшы люк, першы сеў у машыну

в) Раз-пораз стукалі, падаючы, спілаваныя дрэвы

г) Нізкае неба, засланае шэраю смугою, кожную хвіліну гатова было пырснуць халодным дажджом.

**5. Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі:**

а) Уся сям’я, уключаючы дванаццацігадовага Мішу, сядзела за сталом.

б) У нядзелю, а дзесятай гадзіне, мы пойдзем сустракаць майго тату.

в) Цецярук, сарваўшыся з галіны, залопаў крыламі.

г) Вузкая дарожка, паросшая высокай мятліцай, вяла праз лес.

д) З поўначы ішоў вецер, халодны, сіверны.

**6. Адзначце сказы, у якіх правільна выдзелены адасобленыя члены:**

а) Сакратар надзеў акуляры і гледзячы на карту, усміхнуўся.

б) Ён, рукі склаўшы, сядзець не будзе.

в) Дыхнуў густы, цёплы ветрык.

г) Вецер, рэзкі і пявучы, часта свішча за акном.

д) Пад’ехаўшы да школы, Лабановіч выскачыў з драбінак і ўзышоў на ганак.

**7. Адзначце сказы, якія пабудаваны няправільна:**

а) Назбіраныя грыбы за дзень турысты падсмажылі на вячэру.

б) Даручанае класу заданне настаўнікам мы выканалі ахвотна.

в) Ля дарожкі раслі кветкі пасыпанай жоўтым пясочкам.

г) Партызаны адпачывалі на паляне, акружанай з усіх бакоў сцяною лесу.

**8. Адзначце сказы, у якіх прыдатак не з'яўляецца адасобленым (і не выдзяляецца на пісьме).**

а) Непадалёку ад рэчак выводзіць свае трэлі сціплы начны спявак салавей.

б) Флора або расліннасць Белавежскай пушчы зацікавіла вучоных.

в) Старожка нізенькая, сухенькая бабка пазнаёмілася з настаўнікам яшчэ ў першы дзень яго прыезду.

г) Чалавек стрыманы і далікатны ён усё ж не мог прамаўчаць цяпер.

**9. Адзначце літары сказаў, у якіх ёсць адасобленыя дапаўненні.**

а) Алена замест маці навяла парадак у хаце.

б) Гасцей сабралася чалавек пятнаццаць пераважна саслужыўцы гаспадара.

в) Асабліва я не ганюся за сучаснай модай.

г) Ніхто нават вецер не кранае галін яблынь і груш у белай квецені.

**10. Адзначце сказы, у якіх удакладняльныя члены адасоблены правільна.**

а) Позна вечарам, каля дзесяці гадзін, мне пазваніў Антонаў.

б) Каля школы, на клумбах  расце безліч розных кветак.

в) Сёння, 15 мая, мы адзначаем дзень сям'і.

г) Тут, у лесе, сярод елак, змрок здаваўся яшчэ гусцейшым.

**II варыянт**

**1. Адзначце сказы з адасобленымі членамі:**

а) Сняжынкі садзіліся на рукі на твар прыемна казыталі цёплым халадком.

б) Усхваляваная Марыя Мікалаеўна не магла ўтаіць сваіх пачуццяў.

в) Пакойчык заліты сонцам выглядаў вельмі прыветна.

г) Мірнае шчодрае лагоднае неба над намі.

**2. Адзначце сказы, у якіх адасобленыя прыдаткі не выдзелены коскамі:**

а) Настаўнік яшчэ зусім малады хлапец ледзь-ледзь усміхнуўся мне.

б) Я, сціплы педагог, пераступаю боязна парог.

в) На сінем небе-акіяне павіслі хмаркі-астраўкі.

г) Ой ты, Волга-рака, поўны шчасця твой лёс.

**3. Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі:**

а) Ганна, апрануўшыся, выйшла з хаты.

б) Лес жалобную гаворку, свой гоман восені, канчае.

в) За рачулкай раскінуліся балотныя абшары, заросшыя асакой.
г) Моцна спалі высокія травы, прыгрэтыя гарачым сонцам.

**4. Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі:**
а) Марына з хваляваннем сачыла за гэтай падзеяй, поўнай чалавечага шчасця.
б) На ганку маці, выйшаўшы, стаіць і ўдаль, куды паехаў сын глядзіць.
в) Дзіву даешся, чытаючы гэтыя старонкі Янкі Скрыгана.
г) Васіль, замест сшытка, паклаў на стол некалькі лістоў чыстай паперы.

**5. Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі, якія выражаны адзіночным дзеепрыслоўем:**
а) Падсілкаваўшыся, Пятро рушыў далей.
б) Іх здзівіў цудоўны квартал горада, абнесены сцягамі.
в) Ён сказаў адно толькі слова, простае, шчырае, і працягнуў Машы руку.
г) Выветрыўшы неба, ходзяць маразы.

**6. Адзначце сказы, у якіх правільна выдзелены адасобленыя члены:**
а) Павел Тарасевіч седзячы на прызбе, услухоўваўся ў цішыню вёскі.
б) Хлопцы прытаілі дыханне і не зводзілі з дзядзькі вачэй, поўных захаплення.
в) Ён задаволены, усміхаецца.
г) Сакратар надзеў акуляры і ўсміхнуўся, гледзячы на карту.

**7. Адзначце сказы, якія пабудаваны няправільна:**
а) Ягады, назбіраныя за дзень, дзеці з’елі на вячэру.
б) Заданне, даручанае атраду камандзірам, мы выканалі ахвотна.
в) Ля дарожкі раслі адуванчыкі, пасыпаныя жоўтым пяском.
г) Адпачылі на паляне турысты, акружаныя з усіх бакоў сцяною лесу.

**8. Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі, якія выражаны дзеепрыслоўным зваротам:**
а) Час ад часу бліскала маланка, асвятляючы поплавы.
б) Андрэйка, стоячы ля ганка, міжвольна заглядзеўся на дуб
в) Аўтобусы, збочыўшы з шашы, праехалі па лясной дарозе з кіламетр і спыніліся.
г) Змрок, густы, халодны, нерухома аблягаў зямлю.

**9. Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі, якія адносяцца да асабовага займенніка:**
а) Раптам сыпануў дождж, цёплы, без бліскавіцы.

б) І была яна, гэта сасна, самай прыгожай і высокай з усіх сясцёр.

в) Бывалы разведчык, ён ведаў цану ваганняў, высокую радасць знаходак.

г) Андрэй, старэйшы Платонаў сын, служыў у Чырвонай Арміі.

**10. Адзначце сказы, у якіх правільна выдзелены адасобленыя члены:**

а) Павел Тарасевіч седзячы на прызбе, услухоўваўся ў цішыню вёскі.

б) Хлопцы прытаілі дыханне і не зводзілі з дзядзькі вачэй, поўных захаплення.

в) Ён задаволены, усміхаецца.

г) Сакратар надзеў акуляры і ўсміхнуўся, гледзячы на карту.

## III варыянт

**1. Адзначце сказы, у якіх адасобленыя прыдаткі не выдзелены коскамі:**

а) Сышлі халодныя туманы, заслоны шэрыя смугі.

б) Нам моладзі ніякія выпрабаванні не перашкодзяць.

в) Перад чытачамі выступіў Рыгор Барадулін паэт.

г) Зашумеў на лад суровы вольны вецер, сонца сын.

**2. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя спалучэнні не з'яўляюцца прыдаткамі і не адасабляюцца.**

а) Звычайна мы лавілі плотак *або акунёў* і *язёў.*

б) Не раз нам даводзілася лавіць вусачоў *або міронаў* як іх яшчэ называюць.

в) *Як дальнабачны палітык* Усяслаў прадбачыў намеры некаторых князёў.

г) Іван Пятровіч *як урач* вядомы ўсюды.

**3. Адзначце сказы з адасобленымі членамі:**

а) Ахутаныя палогам туману, навакольныя прадметы становяцца незнаёмымі.

б) Вось-вось павінен прачнуцца першы жаўранак і, атрасаючы крапелькі з шэрага пер'я, узняцца над полем.

в) На палетках засталося шмат смецця пасля неахайнай работы вятроў і туманаў – старых дворнікаў вясны.

г) Толькі зрэдку ў недасяжнай вышыні зіхацелі белыя, як пух, воблакі.

**4. Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі, якія выражаны адзіночным дзеепрыслоўем:**

а) Падсілкаваўшыся, Пятро рушыў далей.

б) Іх здзівіў цудоўны квартал горада, абнесены сцягамі.

в) Ён сказаў адно толькі слова, простае, шчырае, і працягнуў Машы руку.

г) Выветрыўшы неба, ходзяць маразы.

**5. Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі, якія адносяцца да асабоага займенніка:**

а) Ганна, маці Лабановіча, была жанчына руплівая.

б) Мы, беларускія школьнікі, павінны быць дастойнымі сваёй Радзімы.

в) Мы спыніліся ў вёсцы Зарэчча, што стаіць на беразе рэчкі Друць.

г) Вопытны журналіст, ён упершыню адчуваў сябе ніякавата, знаёмячыся з чалавекам.

**6. Адзначце сказы, у якіх правільна выдзелены адасобленыя члены:**

а) Сакратар надзеў акуляры і гледзячы на карту, усміхнуўся.

б) Ён, рукі скалаўшы, сядзець не будзе.

в) Дыхнуў густы, цёплы ветрык.

г) Вецер, рэзкі і пявучы, часта свішча за акном.

д) Пад’ехаўшы да школы, Лабановіч выскачыў з драбінак і ўзышоў на ганак.

**7. Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі:**

а) Уся сям’я, уключаючы дванаццацігадовага Мішу, сядзела за сталом.

б) У нядзелю, а дзесятай гадзіне, мы пойдзем сустракаць майго тату.

в) Цецярук, сарваўшыся з галіны, залопаў крыламі.

г) Вузкая дарожка, паросшая высокай мятліцай, вяла праз лес.

д) З поўначы ішоў вецер, халодны, северны.

**8. Адзначце сказы з адасобленымі членамі:**

а) Рэчку, па ўсім відаць, пачынаюць засяляць бабры.

б) Сад пачынаўся адразу ж за маліннікам, густым і высокім.

в) Кучаравыя вербы нагнуліся нізка, да самай зямлі.

г) Зрэдку павяваў невялікі ветрык, ціха калышучы лісце дуба.

**9. Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі:**

а) Ззяюць сняжынкі-дыяменты на хустцы ў дзяўчыны.

б) Увечары адведаць госця прышоў Віктар бібліятэкар.

в) Сын лесніка я сам з маленства любіў паліць касцёр.

г) Нягледзячы на добрае навор’е ўраджай сабралі без страт.

**10. Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі:**

а) Ганна, апрануўшыся, выйшла з хаты.

б) Лес жалобную гаворку, свой гоман восені, канчае.

в) За рачулкай раскінуліся балотныя абшары, заросшыя асакой.

г) Моцна спалі высокія травы, прыгрэтыя гарачым сонцам.

### *Парадак сінтаксічнага разбору простага сказа*

1. Знайсці граматычную аснову сказа і ўстанавіць, што ён просты.

2. Назваць тып сказа паводле адносін зместу да аб’ектыўнай рэчаіснасці (сцвярджальны, адмоўны).

3. Тып сказа па мэце выказвання і інтанацыйным афармленні (апавядальны, пабуджальны, пытальны; клічны – па эмацыянальнай афарбоўцы).

4. Тып сказа па структуры:

- па наяўнасці граматычных саставаў (аднасастаўны, двухсастаўны, калі аднасастаўны, то які);
- па наяўнасці ці адсутнасці даданых членаў сказа (развіты, неразвіты);
- поўны ці няпоўны.

5. Ускладнены або няўскладнены, калі ўскладнены, то чым (аднароднымі, адасобленымі членамі, устаўнымі словамі або сказамі, звароткам і інш.)

6. Разабраць сказ па членах сказа і вызначыць, чым яны выражаны.

7. Растлумачыць расстаноўку знакаў прыпынку.

*Густы вецер гойдаў верхавінамі дрэў, абмытых даждом.* – сказ просты, сцвярджальны, апавядальны, двухсастаўны, развіты, поўны; ускладнены адасобленым азначэннем, выражаным дзеепрыметным словазлучэннем, стаіць пасля азначаемага слова, таму і выдзяляецца коскамі.

*У цёмным небе – карагоды сінявастых зорак.* – сказ просты, сцвярджальны, апавядальны, двухсастаўны, развіты, няпоўны, эліптычны (з апушчаным дзеясловам-выказнікам са значэннем дзеяння – *зіхацяць*); няўскладнены, працяжнік у няпоўным сказе ставіцца на месцы апушчанага выказніка.

*Добрага чалавека не перахваліш.* – сказ просты, сцвярджальны, апавядальны; аднасастаўны, з галоўным членам выказнікам, сказ абагульнена асабовы; развіты, поўны, няўскладнены.

*Думак народных сягоння не змерыць.* – сказ просты, сцвярджальны, апавядальны; аднасастаўны, з галоўным членам выказнікам, сказ інфінітыўны; развіты, поўны, няўскладнены.

# СКЛАДАНЫ СКАЗ

### Пытанні для самаправеркі

1. Дайце азначэнне складанага сказа. У чым яго адрозненне ад простага?
2. Пералічыце агульныя рысы складанага сказа.
3. Назавіце асноўныя віды сінтаксічнай сувязі частак складанага сказа.
4. Назавіце сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі складанага сказа.
5. Назавіце тыпы складаных сказаў.
6. Што ляжыць у аснове падзелу складаных сказаў на тыпы (віды)?
7. Пералічыце пераходныя выпадкі паміж злучэннем і падпарадкаваннем у складаным сказе.

### Практычныя заданні

***Спішыце тэкст, расстаўляючы там, дзе трэба знакі прыпынку. Адзначце простыя і складаныя сказы. Зрабіце сінтаксічны разбор простага сказа (на выбар) і сінтаксічны разбор трох словазлучэнняў.***

Увечары я сама папрасіла Валодзю Арцюка ўзяць мяне на балота, каб разам сустрэць гасцей з Вялікай зямлі.

Апоўначы запалілі кастры. Размешчаны яны былі так, каб утварыўся ўмоўны сігнал. Год назад, у сорак другім, калі партызаны не мелі яшчэ вопыту і надзейнай радыёсувязі, былі выпадкі, калі немцы і паліцаі, убачыўшы партызанскія кастры, раскладвалі свае непадалёку і ўводзілі лётчыкаў у зман. У нашай зоне так трапіла да ворага дыверсійная група. Хлопцы вялі цяжкі няроўны бой, у выніку з семярых толькі двое вырвалася з фашысцкай пасткі.

Ноч была па-летняму цёплая, зорная. Фантастычна, як у глыбокай старажытнасці на баявым стане войска, гарэлі не вельмі яркія кастры. Дым не ўзнімаўся ў гору, а слаўся па балоце, як цягнецца у лагчынах пасля дажджу доўгімі пасмамі туман. Каля кастроў засталіся пэўныя людзі, па адным каля кожнага, каб падкідваць галлё, спачатку сыраватае – падтрымліваць жар. Пасля, калі пачнецца шум матораў, яны падкідваюць сухое, якое успыхне, як порах. Астатнія ляжалі на краі балота ў бярэзніку, бо трэба быць гатовымі да любых нечаканасцей.

*Паводле І. Шамякіна*

# СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫ СКАЗ

### Пытанні для самаправеркі

1. Назавіце характэрныя рысы складаназлучанага сказа.
2. Пералічыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.

3. Правілы пабудовы складаназлучанага сказа.

4. Выкарыстанне складаназлучаных сказаў у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

***Парадак сінтаксічнага разбору складаназлучанага сказа***

1. Вызначыць часткі (прэдыкатыўныя адзінкі), якія ўваходзяць у складаназлучаны сказ (назваць іх).

2. Сродкі сувязі прэдыкатыўных частак: злучальныя злучнікі (спалучальныя, супраціўныя, размеркавальныя) і інтанацыя.

3. Сэнсавыя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі: спалучальныя (з часавай і прычынна-выніковай залежнасцю), супраціўныя (з супастаўленнем і супраць пастаўленнем), пералічальна-размеркавальныя (у якіх выражаюцца з’явы аднолькава магчымыя, або немагчымыя, адбываюцца папераменна ці ўзаемна выключаюцца), далучальныя (з дапаўняльным значэннем).

4. Растлумачыць знакі прыпынку.

5. Складзіце схему сказа.

*У кузні пры майстэрні гулка стукаў аўтаматычны молат і гудзеў горан.*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназлучаны, складаецца з дзвух частак (прэдыкатыўных адзінак).

2. Часткі звязаны спалучальным злучнікам *і* і інтанацыі.

3. Паміж часткамі спалучальныя адносіны са значэннем аднačасовасці.

4. Часткі складаназлучанага сказа коскай не раздзяляюцца, паколькі ёсць агульны для іх дадзены член сказа.

5. [ ] і [ ]

**Практычныя заданні**

***1. Выпішыце складаназлучаныя сказы, падкрэсліце граматычную аснову ў кожным сказе, састаўце схему.***

1) Вясна была яшчэ ў пачатку, але снягі ўжо раставалі. 2) Бацька моўкне і чакае, што скажа дзядзька або маці. 3) Знаю: няма таго зелля, што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылечвае. 4) Рыбак быў дзядзька наш Антоні, як і работнік, адмысловы; а Уладзік пасвіў дзесь каровы, травіў чужыя сенажаці; а дома з дзецьмі была маці. 5) Спадзе вада, і травы забуяюць. 6) Вецер дзьмуў, і шумеў па-над Нёманам бор. 7) У гэтыя дні заняты і жнеі, і механізатары, і малацільшчыкі, і шафёры, і возчыкі, і наогул усе, ад старога да малога. 8) Раптам у лесе шаснула, і на паляну выскачылі дзве казы. 9) Пакой быў хоць і невялікі, але чысты і ўтульны. 10) Я сам люблю прыход вясны, малочнае цвіценне вішань, і спеў драздоў, і шум лясны. 11) Час ад часу прагудзе аўтамашына або, выкрасаючы дугой сінія іскры, прагрукоча

амаль пусты трамвай. 12) Багата адгуло паводак і адцвіло на лузе траў. 13) Мужайся ж, мая непакорная, мацуйся, ідзі, працавітая, да новых здабыткаў, краіна! 14) Сына трэба жаніць, ды і дачка на выданні. 15) Жыта, якое шумела навокал, вецер хістаў у бакі. 16) Чалавек апрацоўваў зямлю, даглядаў жывёлу, будаваўся, гадаваў і выхоўваў дзяцей, наладжваў узаемаадносіны з суседзямі і з усім навакольным светам, святкаваў святы, весяліўся або смуткаваў – і пастаянна думаў, турбаваўся: а што ад яго пяройдзе, перадасца ў спадчыну? 17) Магутны дуб стаяў на строме Сожа, і Сож, робячы вакол дрэва пятлю, паважліва абыходзіў яго з трох бакоў, ведаючы моц каранёў асілка, іх трывалую повязь з зямлёй і даўно адмовіўшыся ад некалі пэўнай надзеі змыць строму з дрэвам разам. 18) Вее вецер, свішча ў коміне, горка плача, надрываецца; і цяпер мне тая музыка, як жывая, успамінаецца. 19) Нам было весела разам з гэтай мяцеліцай, і мне ад радасці хацелася пад разгалістай ліпай спяваць пра снег і пра зіму. 20) Па самай зямлі паўзлі мурашачкі, і былі яны занадта заняты сваёю працай. 21) Закрыеш вочы, і дзіўныя вобразы адзін за адным лунаюць у карагодзе бясконцым. 22) Загадуем сад навокал, там зязюля закукуе. 23) Ці помніш ты сваёй зямлі прасторы, ці бачыў ты віры імклівых рэк? 24). Ці то блізкасць падзей, ці то свежае начное паветра напаўняла сэрца Васіля Іванавіча асаблівай прыўзнятасцю. 25) Стары ўсміхнуўся, і ўсмешка разгладзіла густыя маршчакі на лбе. 26) Жыта, якое шумела навокал, вецер хістаў у бакі. 27) Шуміць вецер ці гудзяць правады. 28) Працавіты наш дзень адпачыць адышоў, толькі стужка зары дагарае над садам. 29) Сымон ніколі не скардзіўся, што ў яго ныюць ногі ці ломіць паясніцу. 30) Начны лес, ціхі, ледзь улоўны гул маразявых соснаў, цішыня лясных нетраў – адным словам, усё настройвала на роздум. 31) Празвініць у сенях муха, альбо хрусне дзесь сучок. 32) Мікіта трохі саромеўся, і прамова яго была не зусім гладкая, але ён гаварыў шчыра, з перакананнем. 33) Часам крылы ветрака круціліся, і мне здавалася, што ён махае рукамі, нібы некага кліча. 34) Ці то ішлі на працу сяляне, ці пастушкі дзе гналі кароў на пашу, ці мо рухаўся паблізу які вайсковы атрад. 35) Людзі слухалі ўважліва і баяліся, відаць, прапусціць хоць адно слова. 36) Часам трапляліся на гэтай неабсяжнай раўніне вялізныя купы нагрувашчанага камення, часам буры конус – нейкі пакрыўджаны Богам чалавек выбіраў трапу невядома дзеля чаго, – часам сіратліва глядзела на дарогу адным акенцам хатка з высокім комінам, і вакол яе – ані дрэўца. 37) Заўтра трэба будзе заказаць старасту фурманку і паехаць да воласці забраць школьныя прыналежнасці, трэба пазнаёміцца там з настаўнікамі і параіцца з імі наконт розных пытанняў, звязаных са школай, трэба таксама зайсці і да бацюшкі і запрасіць яго прыехаць сюды адслужыць малебен перад пачаткам заняткаў. 38) Стаяў калісь тут бор стары, і жыў лясун у тым бары. 39) Нямала навальніц бачыла ліпа, і не адзін раз перуны білі ў яе верхавіну, але яна ўсё вытрымала. 40) Трапяталі матылькі і гулі мошкі.

***4. Спішыце сказы, дзе трэба расстаўце знакі прыпынку, графічна растлумачце свой выбар.***

1) Ці мала на свеце цудоўных мясцін__ ці мала добрых і шчырых людзей! 2) Цёпла__ і ўтульна. 3) У нізінах мякка закучаравілася трава__ і пракінуліся залатыя вочкі кураслепу. 4) Згарэлі дровы__ а вуголле яшчэ захоўвала агонь. 5) Момант__ і Сцёпкава постаць знікае з вачэй. 6) Жаўтком міргне нядрэмны святлафор__ і я спыню сваё таксі. 7) Пад напорам буры рыпелі кроквы__ і глуха стагналі сцены. 8) Беларуская зямліца мяне ўзгадавала__ а маці на мове беларускай песні мне спявала. 9) Чалавецтва прайшло вялікі шлях__ і гэты шлях нас вучыць мудрасці. 10) Сяло__ і бацькава хата.

***5. Расстаўце знакі прыпынку ў наступных сказах, зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

1) Прайшлі дажджы і ўсё буяе.

2) Ноч выдалася цеплая але лес відаць не спаў.

3) Згодна ў полі ўздоўж дарогі каляіны ўюцца ды ніколі між сабою яны не сальюцца.

4) Вясна была яшчэ ў пачатку але снягі ўжо раставалі і дружна ў полі балбаталі раўкі рачулкі.

5) Няспынна магутна ідзе наперад жыцце і няспынна чароўна мяняецца воблік роднага краю.

## Праверачная работа

**1. Адзначце складаназлучаныя сказы:**

а) Дзіма нагнуўся, хацеў пагладзіць верабейку, а ён зусім сцяўся, прыціснуўся да зямлі.

б) У цёмным парку было ціха, і ў паветры прабіваўся пах прэлага мінулагодняга лісця.

в) Жанчына гнулася па-ранейшаму, падбіраючы пракос ды вяжучы снапы, аднак ёй стала трохі лягчэй.

г) Сарокін устаў, ветліва падзякаваў за пачастунак і кампанію і, звяртаючыся да Рыгора Агеевіча, прапанаваў разам пагуляць, пагаварыць па-мужчынску.

д) Таня вельмі не хацела, каб тата ехаў у камандзіроўку.

е) Мы былі пераведзены ўжо ў дзясяты клас, і ад гэтага на душы было і радасна, і трывожна.

ж) Я накіраваўся спачатку ўздоўж лагчыны, а пасля крута звярнуў да Балотных Ялін хмызамі.

з) Мінералы з групы кварцу лёгка пазнаць, бо яны сустракаюцца ў выглядзе крышталёў вельмі характэрнай формы.

и) Праваднiца разгубілася ад такой псіхалагічнай атакі, а людзі ў чарзе грымнулі смехам.

к) Спачатку зубры абменьваліся грознымі позіркамі, хадзілі адзін вакол аднаго, схіліўшы магутныя, цяжкія галовы, і толькі сярдзіта фыркалі, набіраючыся злосці.

**2. Адзначце складаназлучаныя сказы з аднатыпнымі часткамі:**

а) Поле вялікае, і на ім у некалькіх месцах сярод збожжа віднеюцца яблыні, грушы і слівы.

б) І дождж ужо не лье, і гром здалёку грыміць, а мы не вылазім з дупла.

в) Будавацца было цяжка, але Антось быў майстар на ўсе рукі.

г) Вальсаваць не было месца, і мы, прыціснуўшыся адно да аднаго, стоячы, перастаўлялі толькі ногі з месца на месца.

д) Ужо іграў гармонік, і моладзь гуляла польку, з тупатам уздымаючы пыл.

**3. Адзначце складаназлучаныя сказы з разнатыпнымі часткамі:**

а) Збіраюся ў камандзіроўку, а на вакзале няма білетаў.

б) Надыходзіў вячэрні змрок, і ад гэтага яшчэ ўтульней было каля агню.

в) Малыя, як мышы, рынуліся пад ложак, і ў хаце стала на момант ціха.

г) Наладжвалася жыццё, але пачала хварэць маці.

д) За садам плыло сонца, свецячы проста Алесю ў твар, і ліхтары ў кнізе здаваліся чырвонымі.

**4. Адзначце складаназлучаныя сказы, часткі якіх звязаны спалучальнымі злучнікамі:**

а) То пісне нейкая птушка, то прарэзліва крыкне сава, то хрусне сухая галіна, то пачуецца ледзь значны шолах.

б) Грышку непрыемна было слухаць горкія словы, і ён аж закруціўся на канапе.

в) Мама хацела пагладзіць медзведзяня, але яно павярнулася, забурчала і вышчарыла белыя вострыя зубкі.

г) Іншы раз у скверыку рыпаў гармонік, а на заасфальтаванай яшчэ да вайны пляцоўцы наладжваліся танцы.

д) Толькі плавіліся, залаціліся ў промнях сонца вокны ды кучаравіўся над комінамі дым.

е) А вось праз хмары раптам выглянула сонца, і святло заззяла знізу, адбіўшыся ад зямлі, засланай першым снегам.

ж) Час ад часу прагудзе аўтамашына або, выкрасаючы дугой сінія іскры, прагрукаціць амаль зусім пусты трамвай.

з) Не хацелася выходзіць з дому ў такую непагадзь, але ў мяне была патрэба наведаць знаёмага.

и) Потым паплавок нырнуў на дно, а я, стары рыбак, нават не зварухнуўся.

к) Чытае Таццяна шмат, і пасля кожнай прачытанай кніжкі ў яе нібы крылле адрастае ад захаплення.

**5. Адзначце складаназлучаныя сказы з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі:**

а) Ірка паказвала сваю спрытнасць, а мой кожны крок выходзіў нязграбным.

б) То свеціць сонца, то пахмурна.

в) У Загурскага ўвесь час нервова торгалася шчака, але гаварыў ён спакойна, нават з нейкай асуджанасцю ў голасе.

г) У небе трапяталі крыльцамі, звінелі жаўранкі, і гэты звон выцягнуў шчымлівую тугу з сэрца.

д) Сляды гарачыні яшчэ на тварах носім, ды паплылі ўжо дні ў залатую восень.

е) Плашч расхінуўся, і ўсе ўбачылі за поясам пана два вялікія пісталеты, аздобленыя цьмяным срэбрам.

ж) У сяле яшчэ доўга спяваліся песні, ды дзесь з двара даносіўся брэх патрывожанага сабакі.

з) Карычневая спіна Міколкі на момант знікла з вачэй, а праз хвіліну хлопчык вынырнуў ужо далёка ад берага.

и) На голлі спяць яшчэ пупышкі, але ўжо коміна аловак дымком на мяккай сіні піша вясны ружовы загаловак.

к) Марознай зорнай ноччу на шашы то прасунуцца ціхія сані, то зноў прамчыцца машына.

**6. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:**

а) У адказ толькі спявалі птушкі__ ды цвыркалі конікі.

б) Снег прыкарэў на ялінах і соснах__ і вецер яго не абтрэсвае.

в) Пачатак верасня быў дажджлівым__ і нават старшакласнікі хадзілі ў школу ў верхнім адзенні.

г) У лесе спяваюць дразды, лясныя жаваранкі__ а па балоце важна праходжваецца бусел.

д) У хаце яшчэ стаяла сухаватая, напараная сонцам духата_ і было цемнавата.

е) Толькі калышуцца туманы снегу__ і хістаецца гнуткае галлё лазняку.

ж) Насцечка прачнулася рана__ і ёй ужо не хацелася спаць.

з) Два дні парыла__ і вось на поўдні збіраецца на добры дождж, навальніцу.

и) У новым будынку трымаўся халадок__ і панавала цішыня .

к) Мама добра ўмела гаварыць па-польску__ і жанчыны маглі гадзінамі весці размову, расказваць адна другой пра сваё жыццё.

**7. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі:**

а) Вада ў рацэ цякла ціха, і толькі калі-нікалі чулася рэдкае хлюпанне і ледзь улоўнае булькатанне.

б) Толькі недалёка ціха булькала крынічка, і да хрыпаты надрываўся недзе драч...

в) Хвіліна-другая – і машына ад'язджала ўбок ці выкіроўвала назад на дарогу, імчала ў гараж.

г) Зарумянілася на ўсходзе неба і зямля пачала скідаць з сябе белы вэлюм лёгкага, маёвага туману.

д) З пакалення ў пакаленне перадаваліся таямніцы ткацкага майстэрства, і ўрэшце нялёгкая праца ператварылася ў высокае мастацтва.

е) Каця танцавала высока ўзняўшы галаву моцна прыкусіўшы ніжнюю губу.

ж) У бухту прыйшоў першы ветрык, і разам з ім з прасторнага мора дайшлі да берага і першыя дробныя хвалі.

з) Пазней яны ператворацца ў неспакойны прыбой, які ўскаламуціць ваду ля берага, падыме з дна водарасці...

и) Маленькія бровы яе былі насуплены, а ў прыжмураных вачах застылі цёмныя агеньчыкі.

к) Яны загараліся ў Каці тады, калі яна збіралася зрабіць што-небудзь важнае, нечаканае.

# СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ

## Пытанні для самаправеркі

1. Назавіце характэрныя рысы складаназалежнага сказа.
2. Пералічыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах.
3. Вызначэнне сродкаў сувязі паміж часткамі складаназалежнага сказа? Чым адрозніваюцца злучнікі ад злучальных слоў.
4. На якія віды падзяляюцца складаназалежныя сказы?

## *Парадак сінтаксічнага разбору складаназалежнага сказа*

1. Назваць галоўную і дадатную часткі, месца даданай часткі ў адносінах да галоўнай.
2. Да чаго адносіцца даданая частка (да слова, словазлучэння або да ўсей галоўнай часткі); калі ёсць указальнае слова, то адзначыць.
3. Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (злучнік, злучальнае слова).
4. Тып даданай часткі.
5. Знакі прыпынку.
6. Зрабіць сінтаксічны разбор галоўнай і даданай частак.

*Да тых мясцін, дзе жыў калісь Купала, не зарастуць травою дзікай сцежкі.*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны, складаецца з галоўнай і даданай часткі; даданая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай.
2. Даданая частка адносіцца да назоўніка *мясцін*, паясняе яго, у галоўнай частцы пры назоўніку ёсць указальнае слова *тых*, якое з'яўляецца азначэннем.
3. Даданая частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова *дзе* (у сказе з'яўляецца акалічнасцю).
4. Складаназалежны сказ адначленнай канструкцыі з даданай азначальнай часткай.
5. Даданая частка ад галоўнай аддзяляецца коскай.




***1. Выпішыце складаназалежныя сказы:***

1) У гэтую зіму, калі ідзе снег ледзь не кожны дзень, лес іншы раз падобны на казку;

2) Маладое, яшчэ нібы малочнае, лісце не толькі свеціцца, а быццам бы прасвечваецца;

3) Кожны з нас, сябры, заўсёды з вялікай любоўю ўспамінае родны край, дзе нарадзіўся, правёў дзяцінства, вучыўся, потым пайшоў у свой шлях, у людзі;

4) Праўду кажуць: любая рана гоіцца, калі ад яе не паміраюць;

5) Плашч мала ратаваў ад дажджу, і я пакаціў веласіпед да вёскі, што відаць была кіламетры за тры ад лесу.

***2. Выпішыце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі:***

1) Якая заслуга, такая і пашана;

2) Каб паслухаць прыроду жывую, рана-рана ўстаю на зары;

3) Здаецца мне, што самалётам планіруе над сасняком каршун;

4) Там, дзе сосны гурбою заглядаюцца ў высі, дзе чароты сцяною над вадою ўзняліся, дзе арэшнік развесіў гронкі вочак-арэхаў, заблудзілася ў лесе зялёнае рэха;

5) Ёсць куток на зямлі, дзе крыніцы звіняць, дзе на кожнай сцяжыне курганы стаяць.

***3. Выпішыце складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем:***

1) Дуб ведаў, што купальскі агонь – гэта сонца, якое сыходзіць на зямлю, сонца, якім усё жыве;

2) Радзіма – гэта і сонца ў цябе над галавою, і паветра, якім дыхаеш, гэта і вернасць твайго сябра, і мова, якую даў табе народ, і песня, што засталася ад прадзедаў, і легенда заўтрашняга твайго дня, і геаічная слава бацькоў, і тая дарога, якой ты ідзеш у будучыню;

3) Шырокаю паласою, якая перарываецца толькі зрэдку селішчамі і невялікімі палямі, па беразе нашай ракі цягнуцца бары і нават пушча, дзе растуць меднастволыя карабельныя сосны – выносныя, гонкія;

4) У зімовы час зубры трымаюцца ў такой мясцовасці, дзе лягчэй хавацца ад ветру і снег не такі глыбокі;

5) Алесю здавалася, што і кнігі, і мастацтва хвалююць яго таму, што ў бяскрайніх абшарах зямлі ёсць гэты, дарагі яго сэрцу кавалачак зямлі, што ўтульна змясціўся між дзвюма вёскамі.

***4. Складзіце па схемах сказы.***

[... наз., (дзе...), ...] .

[... наз.], (куды ...) .

[... дзейн.], (як ... ) .

***5. Выпішыце складаназалежныя сказы, вызначце від дадзенай часткі.***

1. Мудрыя ўсіх вякоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве пачціваму чалавеку няма нічога даражэйшага за волю.
2. Няхай грыміць на белым свеце слава, пра мужны і нязломны наш народ.
3. Гнілое ты не падпірай, таму што яно заваліцца ўсё роўна.
4. Жыві, шукай, усё рабі як след, каб на радзіме твой свяціўся след.
5. Калі кахаеш сапраўды, ідзеш да любай у завею.
6. Ды я за тое, каб гордасці нашай і годнасці ніхто не наносіў абраз.
7. З сэрца гвалтоўна не вырвеш кахання.
8. Загарні ў залатую фальгу памяці тое, што дапаможа заўтра жыць.
9. У радах войск, што вызвалялі зняволенную замлю роднай Беларусі, ішлі побач рускія і беларусы, узбекі і казахі, грузіны і башкіры.
10. З сосен празрыста точацца, сцякаюць гукі на сцежкі зор і птушак, мне на рукі.
11. Сляды гарачыні яшчэ на тварах носім, ды паплылі ўжо дні ў залатую восень.
12. Шумяць бары, і шэпчуць травы, і гнуцца ў полі каласы.
13. Як недарэчна, што душы мудрэюць, мужнеюць толькі ад рубцоў уласных.
14. Пайшоў пясняр, а песня засталася, памёр паэт, а песня будзе жыць.
15. Зямля наша – самы святы запаведнік, і трэба, як маці, яе берагчы.

16. Дзівосны скарб – душа людская, дзе выспявае праўда-боль у праўду-радасць.

17. Хопіць і куточка Беларусі, каб цэлы век свой да яе ісці.

***6. Прачытайце тэкст. Выпішыце складаназалежныя сказы. Вызначыце, у якіх з гэтых сказаў часткі звязаны пры дапамозе злучальных слоў, а ў якіх пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў.***

***Выпішыце з першага абзаца тры словазлучэнні з рознымі відамі сувязі і зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

***З другога абзаца выпішыце просты ўскладнены сказ і зрабіце яго сінтаксічны разбор.***

За год перад вайной на адным з ленінградскіх вакзалаў выйшаў з вагона няраслы сціплы хлопец. Ішоў ён па шумлівым праспекце, па тратуарах, запоўненных рухавымі людзьмі, ішоў не спяшаючыся, няўпеўнена азіраючыся. Кожнаму сустрэчнаму чалавеку няцяжка было заўважыць, што хлопец у горадзе ўпершыню, што тут для яго ўсё новае, нязвычнае.

Тады,вядома, ніхто і не здагадаўся, што гэтаму сціпламу хлопцу з ціхай беларускай вёсачкі пад Магілёвам наканавана стаць адным з самых славутых абаронцаў Ленінграда, звязаць назаўсёды сваё кароткае юнацкае жыццё з жыццём вялікага горада. Амаль адразу з вучнёўскай лаўкі, са школы фабрычна- завадскага навучання пайшоў Федзя Смалячкоў на фронт, што падступіў да самых ускраін горада. Ён зрабіў усё, каб затрымаць, не дапусціць ворага у горад Леніна. У дождж і мароз выходзіў ён са снайперскай вінтоўкай, гадзінамі пільна ўглядаўся ў пярэдні край праціўніка. Забіўшы некалькі соцен варожых салдат, ён загінуў сам, абараняючы Ленінград.

Трэцім ваенным летам, перад пачаткам грандыёзнага наступлення савецкіх войск у Беларусі, рускі хлопец Юрый Смірноў, такі ж юны, як Федзя Смалячкоў, быў захоплены ворагам у палон. У юнага аўтаматчыка спрабавалі выведаць, дзе і калі будзе наступаць яго часць. Ні пагрозы, ні катаванні не зламалі ўпартага маўчання салдата, ён памёр у страшэнных пакутах за беларускую зямлю.

*Паводле І. Мележа*

***7. Прачытайце тэкст. Выпішыце складаназалежныя сказы, вызначце від даданай часткі. Вызначыце, у якіх з гэтых сказаў часткі звязаны пры дапамозе злучальных слоў, а ў якіх пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых сказаў. Зрабіце сінтаксічны разбор аднаго словазлучэння (на выбар).***

Сапёр

Любая салдацкая служба нялёгкая, а сапёрская ці не самая цяжкая і небяспечная. Там, дзе пройдуць танкі, а за імі пяхота, перш пройдуць са-

пёры, бо яны павінны абясшкодзіць міны, пракласці шлях войску. Нездарма кажуць, што сапёр памыляецца адзін раз. Яго памылка варта жыцця.

Ён быў смелы і мужны, наш салдат-сапёр. У яго былі моцныя нервы і ўмелыя рукі. **Сотні мін размініраваў ён, мосцячы доўгую дарогу да Перамогі.**

**Ён вярнуўся дадому, спадзеючыся, што будзе займацца мірнай справай хлебароба.** Ды дома чакала бяда. На нямецкай міне, што засталася ў зямлі, падарваўся яго сын. **На вайне салдат бачыў нямала смерцяў, але ссівеў у трыццаць пяць гадоў, перажыўшы смерць сына.**

Аднойчы ён пачуў, што ў гарадской бальніцы ёсць цэлая палата дзяцей, якія падарваліся на мінах. Салдат зазірнуў у тую палату і быў уражаны не менш, чым смерцю сына.

І салдат зноў апрануў шынель.

*Паводле М. Гіля*

***8. Прачытайце тэкст. Выпішыце складаназалежныя сказы, вызначце від даданай часткі. Вызначыце, у якіх з гэтых сказаў часткі звязаны пры дапамозе злучальных слоў, а ў якіх пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў. Пабудуйце схемы складаназалежных сказаў. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых сказаў.***

Выпадак у лесе

На залітай сонцам сасне прыхарошвалася вавёрка. **Бачыла, што я сачу за ёй, і нібы старалася мне спадабацца.** Трымалася велічна, грацыёзна. Здавалася, што яна адчувала сябе гаспадыняй і заклікала мяне смялей трымацца.

Раптам яна зляцела на зямлю і хутка пабегла туды, дзе сярод лесу віднелася шырокая прагáліна. Калі я прыбег на палянку, вавёрка сядзела сярод маліннiку. Нахіляла лапкамі галінку, каб ямчэй было браць ягады, і ласавалася малінамі, якімі шчодра былі абсыпаны кусты.

Я хацеў абысці вавёрку, каб не спудзіць, але яна сама выскачыла з кустоўя, уселася на зялёнай галінцы елкі і, здаецца, радавалася, што прывяла мяне сюды, у ягады.

Калі я вылез з малінніку, ужо вечарэла. **На палянцы доўжыліся цені.** Я спалохаўся, што тут мяне застане ноч, бо не ведаў, у які бок ісці дахаты.

*Паводле У. Мяжэвіча*

## Праверачная работа
## Варыянт 1

*Спісаць тэкст, расставіць знакі прыпынку, уставіць прапушчаныя літары, раскрыць дужкі. Знайсці складаназалежны сказ і зрабіць яго поўны сінтаксічны разбор. З першага сказа выпісаць словазлучэнні і зрабіць іх сінтаксічны разбор.*

Багдановіч лічыўся(б) выдатным паэтам і тады калі(б) ён нам пакін...ў толькі вершы аб роднай прыродзе. На шчасце яго паэтычны талент ра...крываўся так шчодра (не)толькі ў пейзажнай лірыцы але і ў творах (сацыяльна)грама...кага зместу і ў вершах пра каханне і ў ф...ласо...скіх міні...цюрах на тэму жыцця і смерці.

*Ніл Гілевіч*

**Варыянт 2**

*Спісаць тэкст, расставіць знакі прыпынку, уставіць прапушчаныя літары. Знайсці складаназалежны сказ, просты ўскладнены сказ і зрабіць іх поўны сінтаксічны разбор.*

У гісторыі кожнага народ... ёсць імёны якімі ён асабліва ганары...а. Але ёсць сярод іх і такія якія сталі здабыткам чалаве...тва бо слава іх перасягнула межы краін і часоў. Беларускі паэт Максім Багдановіч набыў вядомасць сваім літараутрным грамдзянскім і чалавечым по...вігам.

*М.Чыркі*

**Варыянт 3**

*Спісаць тэкст, расставіць знакі прыпынку, уставіць прапушчаныя літары. Знайсці складаназалежны сказ, просты ўскладнены сказ і зрабіць іх поўны сінтаксічны разбор.*

Сяргей прадзіра…ся праз калючае кустоўе ядлоўцу зыркаючы па б..ках. На твар чаплялася мокрае павуцінне а за каўнер сып…лася ігліца. Першую чаро…ку казлякоў убачыў на палян…ы. Дастаў складанік і пачаў зразаць слі…кія карычневыя кап…люшыкі. Пакуль збіраў праз спляценне галінак заўважыў яшчэ некалькі грыбоў.

## СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ

### Пытанні для самаправеркі

1. Пералічыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі.
2. Вызначэнне сродкаў сувязі паміж часткамі складаназалежнага сказа?
3. Чым адрозніваюцца злучнікі ад злучальных слоў.
4. На якія віды падзяляюцца складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі?

### *Парадак разбору складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі*

1. Вызначыць колькасць частак (прэдыкатыўных адзінак), назваць галоўную і даданыя.

2. Сродкі сувязі паміж часткамі складаназалежнага сказа (злучнік, злучальнае слова).

3. Тып сказа ў залежнасці ад будовы і ўзаемаадносін частак: складаназалежны з паслядоўным падпарадкаваннем, сузалежным або паралельным (аднародным і неаднародным), змешаным, комплексным падпарадкаваннем.

4. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі і іх адценні. На якое пытанне адказваюць даданыя часткі, тып даданых частак.

5. Знакі прыпынку.

6. Зрабіць сінтаксічны разбор сказаў.

*Я кожны дзень хаджу на спатканне з табою, мой родны горад, хаджу і слухаю, як шапоча лісце ў Купалаўскім скверы, як шумяць над Свіслаччу вербы, як весела смяюцца і спяваюць закаханыя пары.*

1. Сказ складаны, злучнікавы, складаназалежны з некалькімі даданымі, складаецца з чатырох частак – прэдыкатыўных адзінак (назваць галоўную (1) і даданыя (2,3,4).

2. Даданыя часткі звязваюцца з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова як (у сказах выконвае функцыю акалічнасці).

3. Даданыя часткі адносяцца да галоўнай, паясняюць дзеяслоў-выказнік *слухаю*; па характары ўзаемаадносін частак – сказ з аднароднымі даданымі часткамі.

4. Даданыя часткі дапаўняльныя, адказваюць на пытанні *што*?

5. Паміж часткамі складанага сказа ставіцца коска, у галоўнай частцы выдзяляецца коскамі зваротак.




## Практычныя заданні

***1. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах і зрабіце іх сінтаксічны разбор.***

1. Люблю прыпыніцца на плошчы Перамогі дзе ля падножжа велічнага абеліска палыхае вечны агонь – агонь нашай нязгаснай любві і ўдзячнасці тым хто загінуў за тваё вызваленне ад фашысцкага рабства. 2. І так ярка прыпомнілася яму [Сцёпку] свая вёска што каб меў крыллі то ўзняўся б і паляцеў бы. 3. І за радасць што з намі ад самага мала на вялікіх жыццёвых шляхах сябравала і за тое што ўмее любіць без дакораў свайго краю прастор яго сонца і зоры і за песню якую калісь ля калыскі ты спявала для нас марай ззяючы ў хаце каб шчасліва жылі мы паклон табе нізкі наша родная маці. 4. Не дзіва што тут каля крынічкі кіпела жыццё бо кожнаму

хацелася стать бліжэй да вады, каб палюбавацца на свае ўласнае хараство ў яе люстры, як гэта любілі рабіць прыгожыя краскі. 5. Вецер зайшоў з вострава. Сыры і густы ён падзьмуў па палудні з-за ракі на Выганчык гонячы мокрыя калючыя наабіваныя зяленыя іголкі што адмерзлі за зіму ў маразы і тонкую як папера жоўтую сасновую кару з верхавін якая блішчала на зямлі мокнучы на снезе. 6. Пасёлак Шушанскі. Хоць нам вядома што мы спазніліся прыйсці сюды і Леніна ўжо не застанем дома ён у дарозе дальняй як заўжды мы накіроўваемся да сядзібы якая тоне ў зяляніне дрэў каб паглядзець надвор на тыя шыбы ў якія некалі і ён глядзеў. 7. Ёсць такі час калі ўсе выспявае і нішто не трывожыць тады велічнага спакою які ахоўвае расліны што безліччу каласоў насяляюць зямлю.

## БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ

### Пытанні для самаправеркі

1. Назавіце характэрныя рысы бяззлучнікавага складанага сказа.
2. Пералічыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў бяззлучнікавым складаным сказе.
3. Інтанаванне бяззлучнікавых складаных сказаў, аналіз сэнсавых адносін паміж часткамі складанага сказа.
4. Пастаноўка знакаў прыпынку і іх абгрунтаванне.
5. Пастаноўка варыятыўных знакаў прыпынку, іх абгрунтаванне.
6. Уключэнне складаных бяззлучнікавых сказаў у выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў.

### *Парадак разбору бяззлучнікавага складанага сказа*

1. Назваць часткі (прэдыкатыўныя адзінкі).
2. Тып бяззлучнікавага сказа ў залежнасці ад структуры і значэння састаўных частак (з аднатыпнымі і разнатыпнымі часткамі).
3. Сэнсавыя адносіны паміж часткамі:

а) у сказе з аднатыпнымі часткамі – адносіны адначасовасці або паслядоўнасці, супастаўляльныя, прычынна-выніковыя;

б) у сказе з разнатыпнымі часткамі – аб’ектыўныя, суб’ектыўныя, прычынна-выніковыя, уступальныя, часу, умовы, далучальныя.

4. Растлумачыць знакі прыпынку.
5. Складзіце схему.
6. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнага сказа.

*Заднія танкі цесна згрудзіліся ў адну кучу, пад’язджалі грузавікі з аўтаматчыкамі, паволі пасоўвалася артылерыйская батарэя.* – складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з трох частак, часткі аднатыпныя, паміж часткамі выражаюцца адносіны паслядоўнасці, часткі цесна сэнсава звязаня, раздзяляюцца коскамі.

*Дажджы прайдуць – грыбы вазамі вазі.* – складаны бяззлучнікавы сказ, складаецца з дзвюх частак, часткі разнатыпныя, даданыя ўмовы, умоўна-выніковыя адносіны, раздзяляюцца працяжнікам.

### Практычныя заданні

***1. Выпішыце спачатку бяззлучнікавыя сказы з аднатыпнымі часткамі, потым – з разнатыпнымі. Ахарактаразуйце структуру частак, якія ўваходзяць у бяззлучнікаквыя складаныя сказы.***

***Зрабіце сінтаксічны разбор тох словазлучэнняў, аднаго простага ўскладненага сказа, складаназлучанага сказа, складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі.***

Над Зарэччам стаяў туман, праз парадзелыя хмары прабівалася сонца. Дзень абяцаў быць цёплым, таму з самай раніцы не сядзелася ў хаце. Хацелася на прастор палёў.

Я пайшоў на возера. Яно вабіла да сябе, і ўначы я часта сніў зялёны востраў ды месячную сцежку на вадзе.

Дождж растапіў снег – цяпер на лёдзе стаяла падсіненая спадыспаду вада. Лёгкі вецер гнаў па ёй дробныя хвалі, і яны падкатваліся да рудых чаротаў, спакойна лажыліся між высокіх сухіх сцяблін. Праз возера бегла чорная дарога, адзінае, што засталося ад зімы і што паволі размывала вада. Далей выступаў проста з вады хмызняк – гэта быў наш востраў. Над востравам у небе звінелі жаваранкі, у бярозавым гаі стаяў грачыны гармідар. Я ўспомніў, як кукавала зязюля, калі мы з Шурай сядзелі на востраве. Успамін не абудзіў былых пачуццяў: яны заглушыліся іншымі, больш моцнымі і стойкімі.

*Паводле А. Асіпенкі*

***2. Спішыце. Вызначце тып складаных сказаў. У бяззлучнікавых складаных сказах назавіце адносіны, якія выражаюцца паміж часткамі.***

1.Ведай: роднае слова грымела ў крывавым агні барыкад, за свабоду адважна і смела заклікала ў паход, як набат. *(Ніл Гілевіч)* 2. Гляджу і дзіўлюся: удала было выбрана для горада гэтае прыгожае месца. *(Васіль Вітка)* 3. Пахне ціхі перасёлак лясной канюшынай, ціха бусел садзіцца на стог. *(А.Вялюгін)* 4. Дрэмлюць знаёмыя плёсы, снегам завеяны лог. *(Максім Танк).* 5. За вокнамі снежныя казкі расказвае сцішаны лес, на шыбах – і пальмы, і краскі, і ціхі задымлены бэз. *(Сяргей Грахоўскі)* 6. Прыслухайся – ціха ў вагоне. Пастукалі – ніхто не адказвае. *(Міхась Лынькоў)* 7. Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед з кургана, як снег, белы выходзіць. *(Янка Купала)* 8. Ад рання да вечара ў кузні стукалі малаткі, горача палыхаў горн. *(Т.Хадкевіч)* 9. Тут раслі магутныя сасновыя бары, зелянелі неабснежаныя плошчы ельніку і піхтарніку, залацілася ўвосень цэлыя гаі бяроз і асін. *(А.Чарнышэвіч)* 10. Быў цікавы дзень без меры: сонца, яснасць, цеплыня. *(Якуб Колас)* 11. Міколка агледзеў вагон – няма дзеда. *(Міхась Лынькоў)* 12. Тоне ў слязах асенняя дарога, халодны дзень імжыць па – над сялом. *(Паўлюк Трус)*

***3.*** ***Спішыце, расстаўце знакі прыпынку. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў. Складзіце схемы складаных бяззлучнікавых сказаў.***

1.Рана ў поле выязджай – лепшы будзе ўраджай. *(Прыказка)* 2. Цвітуць сады на Случчыне маёй, мядовы пах над цэлым краем вее.(*Анатоль Астрэйка)* 3. Родным словам мы грознай парою гартавалі рады змагароў, з родным словам на вуснах герояў запякалася алая кроў. *(Ніл Гілевіч*) 4. Кукавала зязюля ў зялёным лесе, гадавала матуля дачушку Алесю. (*Янка Купала)* 5. Угару зірнеш – як рой пчаліны, снуюцца ціхія пушыны … *(Якуб Колас)* 6. Ледзь прыкмтетна пакачваўся паравоз, аднастайна пастуквалі рэйкі, гуло ў топцы. *(Міхась Лынькоў)* 7. Раптам аўтобус сцішыў ход: на дарозе стаяў чалавек з паднятай рукой … *(Скр.)* 8. Людзі кажуць: у людзей пытай і свій розум май *(Змітрок Бядуля)* 9.Дождж мочыць – сонца сушыць. *(Прыказка)* 10. Цягнік даўно адышоў, вакзал стаў шэрым, будзённым. *(Міхась Лынькоў)* 11. Неба было надзіва чыстае, сонца заходзіла ясна, рэшткіхмар спадалі за далягляд. *(К.Ч.)* 12. Заданне адказнае: трэба з Масквы даставіць атрадам наказ баявы. (*Пятро Глебка)* 13. Лейтэнант зірнуў у адзін бок, у другі – траншэя вяла ў тыл… *(Васіль Быкаў)* 14. А ў душы – прасторна, лёгка, весела май ідзе праз нівы і бары. *(Ніл Гілевіч)* 15. Дэкрэтам сэрца я святы наказ пакіну сыну: прайсці са славай па бацькоўскай светлай старане і ўсёй душой любіць сваю Айчыну.

*Паводле К. Кірэенкі*

***4. Зрабіце сінтаксічны разбор бяззлучнікавых складаных сказаў.***

1.Наступіла вясна – пачаліся палявыя работы. 2. Сонца ўгравала ўсё мацней, было душна і парна. 3. У садах выспявалі залатыя ранеты, упрыгожвала далі хараством сваім лета. 4. Запахла поле зноў раллёю; гракі, вароны чарадою за свежай ходзяць баразно. 5. Дні позняй восені кароткія і шэрыя: адразу пасля поўдня пачынае змяркацца. 6. Андрэй аглядзеў доўгую чаргу – ніводнага знаёмага. 7. Ліпа разраслася – мужчыны ўдваіх не маглі абхапіць яе ў камлі рукамі. 8. Свяціла сонца, ішлі дажджы, зелянела трава.

***5. Спішыце тэкст, расстаўце, дзе трэба, знакі пыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор усіх складаных сказаў.***

***Знайдзіце просты сказ, ускладнены аднароднымі членамі і адасобленым азначэннем, складзіце яго схему.***

Яшчэ сонейка не ўзышло над струменістай Палатой а ў маладым бярэзніку па-над ракой разліваўся салаўіны пошчак. Кожным чэрвеньскім ранкам птушкі быццам спаборнічалі хто лепш спявае. Васька Аляксееў любіў у гэты час лавіць за гора дам рыбу. Ён радаваўся калі на снеданне прыходзіў не з пустымі рукамі. Не кожны дзень выпадала трапіць на рыбалку строгі бацька рана прывучаў яго да работы ў майстэрні. Разам з вучнямі падмайстрамі і двума старэйшымі братамі выраблялі яны розныя

шкляныя ўпрыгожанні пацеркі пярсцёнкі бранзалеты. Асабліва падабаліся Ваську бранзалеты пляскатыя круглыя кручаныя розных колераў і адценняў часам абвітыя танюсенькімі дроцікамі з медзі срэбра а то і золата. На гэтыя вырабы быў попыт не толькі ў Полацку, але і далёка за межамі княства.

Васькавы абавязкі былі нескладаныя трэба было нешта паднесці ці памагчы дарослым. Але ён чакаў той хвіліны калі бацька дазволіць яму самому варыць шкло і адліваць розныя прыгожыя рэчы.

*Паводле С. Тарасава.*

# СКЛАДАНЫ СКАЗ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ (КАМБІНАВАНЫЯ СКАЗЫ)

***Парадак разбору складанага сказа з рознымі відамі сувязі***

1. Тып складанага сказа паводле структуры і сродкаў сувязі прэдыкатыўных адзінак.
2. Вызначыць колькасць прэдыкатыўных адзінак (простых сказаў).
3. Віды сувязі паміж асноўнымі структурнымі часткамі.
4. Структурная характарыстыка частак.
5. Растлумачыць знакі прыпынку.
6. Збаріць разбор кожнай часткі складанага сказа.

*Трэба было адпачыць, але Іван адчуваў, што калі ўпадзе ў снег, то, напэўна, болей ужо не ўстане.*

1. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі (злучальнай і падпарадкавальнай).
2. Складаецца з чатырох частак.
3. Часткі аб’ядноўваюцца ў дзве асноўныя структурныя адзінкі: 1 частка – першая адзінка, 2, 3, 4-я – другая адзінка.
4. 1 і 2 часткі звязаны злучальнай сувяззю (злучнікам *але*).
5. Першая структурная частка – просты сказ, другая – складаназалежны з комплексным падпарадкаваннем.
6. Часткі складанага сказа раздзяляюцца коскамі; паміж сумежнымі коскамі *што калі* коска не ставіцца, паколькі далей ёсць другая частка падпарадкавальнага злучніка то (пропуск дадaнай часткі, звязанай пры дапамозе злучніка *калі – то*, парушае структуру сказа).

## Практычныя заданні

***1. Спішыце сказы, расстаўце знакі прыпынку, вусна растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж прэдыкатыўнымі часткамі складаных сказаў камбінаванай будовы. Складзіце схемы сказаў.***

1. Часам крылы ветрака круціліся, і мне здавалася, што ён махае рукамі, нібы некага кліча. 2. У хвойніку было ціха, толькі час ад часу крыкне

варона, шарахнецца заяц. 3.Ужо ўзышоўшы на двор, Драздовіч заўважыў, што перамяніўся напрамак ветру, значыць, не мінуць навальніцы. 4. Цяпер зноў чуваць, як чахкае сякера: дзядзька цярэбіць на званеным дрэве галлё… Практыкаванне 5. Вызначце тып прэдыкатыўных частак у складаных сказах камбінаванай будовы і пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.
1. Люблю той лес што над табою высока ўзняў свае камлі яго ж карэнні над вадою нібы вянок табе сплялі…2. Сцёпка ведае як называецца станцыя але яму трэба разгаварыцца з хлапчукамі каб дазнацца таго што цікавіла яго цяпер. 3. Высокія хвалі білі ў бераг усё часцей і часцей па ўсяму відаць было што хутка пачнецца шторм. 4. Там дзе праходзіць дарога скрыпяць калёсы чуваць людскія галасы. 5. Ужо хата новая гатова прыбраны трэскі ўжо і дровы над белым дахам як карона красуе комінак чырвоны прыветна вокны пазіраюць бы вас у госці запрашаюць ну добры выгляд хата мае…

***2. Спішыце тэкст, расстаўце, дзе трэба, знакі пыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор усіх складаных сказаў.***

Дарога выводзіла мяне на дзялянку. Гонка і высока стаялі на ёй адзінокія сосны цвіркалі недзе на маладых бярозках садзіліся на зарослыя травой лаўжы разамлелыя аўсянкі. То падаючы ледзь не да зямлі то сігаючы ўгору праляцела чорная жаўна. Быў тут нейкі тужлівы простор, як на старым, забытым дворышчы і ўсё тут было, як бывае ў чалавечым жыцці. Дайшоў я да напаўзаваленага нейкага бліндажа і нечакана для сябе ўбачыў у яго спадзінцы цэлую плойму жоўтых, як кветкі, і прысадзістых лісічак. Але я не спяшаўся іх браць было і без таго за што тут зачапіцца воку. Я ступіў да бліндажа як раптам у цеглавіне нешта зашоргалася затрапяталася а потым ураз трывожна піснула, палахліва заценькала, забілася нейкая птушка. І як бы хто штурхнуў мяне ў грудзі я падаўся назад лес хіснуўся і я чуў ужо адно толькі неба яно кружылася і адтуль плыў і плыў на мяне трывожны бясконцы шоргат. І вось ужо нібыта я ляжаў на зямлі. Не было ўжо ні выбуху ні мяне і змяркалася і тарахцела па дарозе падвода, і галасіла ў лесе мая маці... Было ціха ў лесе і чуваць было як там у цеглавінцы, яшчэ нешта шоргалася але гэта, мусіць, з патрывожанага дрэва падалі кроплі і выпросталіся патрывожаныя галіны. І як бы нанава глянуў я на ўзгорачак, чысты, светлы, абсыпаны шыгаллем праз якое прасвечвала сіняватая зямля, і, можа, ад таго ўзгорачак выдаваў не то фіялетавым не то бэзавым. І мне было ўжо ніякавата за нядаўні спалох і ўжо недзе далёка быў успамін пра тое, як сем гадоў назад падарваўся ў гэтым лесе на міне мой аднагодак-хлопец, наш вясковец...

*Паводле М. Стральцова*

***3. Спішыце сказы, расстаўце, дзе трэба, знакі пыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор.***

1. Хоць снег трымаўся яшчэ на палях хоць па начах можна было лёгка

ісці па хрупасткаму падмарожанаму насту сонца прыгравала з кожным днём усё мацней і мацней адмакрэлі і пацямнелі лагчыны першыя праталіны зачарнеліся на палях прыбярэжныя лазнякі страцілі сваю зімовую празрыстасць і здаецца адразу пагусцелі набраклі пяшчотнымі пералівамі фарбаў шызых ліловых.

2. Хоць даўно развіднелася і ўзыйшло сонца на полі нікога не відаць усе некуды разышліся.

3. Васіль быў шмат дужэйшы а ляснік быў спрыцен як чорт так што праціўнікаў можна было лічыць роўнымі.

4. Над ракой дзе каліна сенажаць церабілі у сяле дзе хлапчына у паход затрубілі.

5. Цяпер зноў чуваць, як чахкае сякера: дзядзька цярэбіць на зваленым дрэве галлё...

6. Фурманка пайшла спакайней і Ляўчук усеўся трохі зручней пасунуўся каб не навальвацца на нерухомае сцягно дэсантніка.

7. Тое што Міканор збіраўся бурыць не чыё-небудзь а сваё гумно не давала супакаення усе разумелі што вельмі хутка за гэтым і ім трэба будзе адважыцца на такую страту.

8. А як раніца настане бляскі сонца загуляюць рос прыходзіць адцвітанне туманы у рэчцы таюць.

9. Настаўнік акумулятар ведаў і духоўнай культуры і ён павінен увесь час падзараджацца каб кожная сустрэча з вучнямі была творчая, поўная гарэння і пошукаў.

10. Дзе пустка была і не ступала нага чалавека там каласіцца шырокая ніва ці высіцца каменны гмах.

11. Іллюк углядаўся ў прадаўгаваты бялёсы твар Шведа і ў сэрцы ўзнікала глыбокая прыязнасць да яго чалавек гаварыў пра агульныя справы так быццам у іх заключалася ўсё яго жыццё.

12. Падоўгу раніца ў туманах сонца носіць антонаўкаю грукаюць сады ідуць са свежым збожжам паязды а павуцінне ўслед як быццам толькі з кросен так неўзаметку падступае восень.

13. У нас ёсць добры звычай калі прыязджаюць госці дык частаваць іх.

14. Аксён ужо нават можа і распісацца што яго вельмі цешыць але гэта яшчэ не сведчыць аб яго пісьменнасці.

15. Над лесам выплыўшы з туману стаяў месяц мяккі і ціхі ён быў цяпер белы што малако і мусіць ад таго зрабілася зялёнае неба з дробненькімі зоркамі.

16. Слых мой толькі праз момант ловіць музыку ціхага шуму лісця ды і то мне спачатку здаецца што гэта ўсё яшчэ шуміць у галаве.

17. Возера пакалыхвала свае хвалі і каб пачуць іх шум трэба было дужа ўважліва прыслухоўвацца да гамонкі дробных хваляў што як срэбра пераліваліся на сонцы.

18. З кніжкамі пад пахай я спяшаўся ў школу і глядзеў як кружацца гэтыя белыя пушынкі і чамусьці мне яшчэ ўявілася тое што было летась.

19. Мне толькі дзіўна было як гэта дазнацца дзе тая пасцель куды кладзецца сонца адпачываць.

20. Калі пад'язджалі да сяла было ўжо цемна і хаты здалек свяціліся агеньчыкамі вокнаў.

21. Слухаў дзед Талаш гэтыя навіны і яго ўласная крыўда заціралася адступала на задні план і стажок што забралі палякі паслужыўшы прычынаю ўсей гэтай бяды здаваўся цяпер маленькаю крупінкаю і губляўся ў дзедавых думках.

22. Мінуў час і Сцяпан Апанасавіч адчуў што зараз то машына ідзе і ідзе як быццам няблага але для таго каб яна і ў дальнейшым працавала і магла развіць яшчэ большую магутнасць трэба сее-тое ў ей замяніць падладзіць узвесці пад ей мацнейшы фундамент.

23. Берагі ў рацэ абрывістыя слізкія ключавыя небяспечныя амуты глыбокія вада зяленая гушчар непраходны і таму тут шмат рыбы што чалавеку цяжка даступіцца да вады.

24. Я гляджу ў неба якое зрашэцілі зоркі і мне здаецца яны таксама глядзяць на мяне і зусім па-чалавечы падміргваюць сваімі доўгімі вейкамі.

25. На сцэне якая крыху ўзвышалася за сталом пасярэдзіне сядзеў Ладуцька а з бакоў знаемы мне дырэктар мясцовай школы Алесь Шарай што працаваў у "Маяку" сакратаром партарганізацыі і два калгаснікі.

## ЧУЖАЯ МОВА

### Пытанні для самакантролю

### Практычныя заданні

***1. Спішыце сказы, вусна растлумачце знакі прыпынку, складзіце схемы сказаў.***

1. Сястра глянула на Галіну Адамаўну. Той хацелася крыкнуць: «Не трэба! Не выходзь!» *(І. Шамякін)*. 2. «Чаму і завошта?» – пыталася яна [Сцепаніда] ў сябе, не знаходзячы, аднак, адказу, і думкі яе ішлі далей, у глыб перажытага *(В. Быкаў)*. 3. «Мама, купі мне гэтую кніжку!» – амаль патрабуе малая *(В. Шніп)*. 4. «Дарога, вандроўка – самае лепшае лякарства ад усякіх напасцей», – зазначае сам сабе Лабановіч і сам сабе ціха ўсміхаецца *(Я. Колас)*. 5. «Стой, брат! – прыпыніў я самога сябе. – Аглух ты сёння, ці што?» *(Я. Брыль)*. 6. «Я рад, пан Савіч, што вы разумееце, – узрадаваўся Грот. – Не, мы не жорсткія. Мы мяккія і добрыя» *(І. Шамякін)*. 7. «Бывай жа, родная засень і родная хата, – думае ён, – і ты, маці, не глядзі так трывожна ўслед» *(М. Стральцоў)*.

***2. Прачытайце вершы, вызначце іх асноўную думку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў канструкцыях з простай мовай. Складзіце схемы канструкцый з простай мовай.***

Я помню, як ты юны, закаханы
Мне прызначаў над Прыпяццю спатканне.
Казаў: «Што будзе з намі – невядома,
Я ад’язджаю[ф] з бацькавага дому,
Давай пасадзім дрэўцы для ўспаміну,
Я пасаджу дубок, а ты – рабіну».
Паехаў ты, і пасля бурнавалаў
Рабінка маладзенькая завяла.[сн]
Дубок трывожна пахіліў галінкі,
Нібы пытаўся: «Што з табой, дзяўчынка?»
Рабіначку на досвітку крамяным
Дубок паіў расой, а я – слязамі.
Гарнуў дубочак лю́бую да сэрца,
І на світанні акрыяла дрэўца.
Рабіначка закрасавала ўранні,
Каб век не гасла, каб жыло каханне...
Ты — мужны дуб, а я – твая рабіна,
Шумім лісцём у згодзе лебядзінай.

*Г. Дашкевіч.*

Паглядамі сустрэліся на хвілю:
«Ну як жыццё?» – «Змагаемся паціху...»
Зноў – хто куды. Нат не пагаварылі.
Адно руку паціснулі на ўздыху.
«Бывай, бывай!..» – «Мо ўсё ж – да пабачэння?..»
Дасць Бог, яшчэ звядуць нас пуцявіны
І мы з табой папросім прабачэння
За несустрэч балючыя хвіліны.

*М. Шабовіч.*

***3. Спішыце сказы. Аформіце канструкцыі з простай мовай у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі лінейным спосабам.***

Сынаў адказ быў заўсёдным і лаканічным / Неяк пражыву! *(Ю. Зарэцкая)*. 2. Дзік! / міжволі падумалася хлопцу / Хутчэй за ўсё, дзік! *(Г. Аўласенка)*. 3. Не пашчасціла сёння. Так бывае. Але надзея ёсць, а без яе не варта на раку выбірацца / разважаў рыбак *(М. Бусько)*. 4. Ну нашто табе / скажуць мне гэтак / у чужое жытло заглядаць? *(М. Кулеш)*. 5. Усім патрэбна ўвага. І бярозе таксама / падумалася жанчыне *(У. Ціхуроў)*. 6. Раскажыце цікавае пра партызан / папрасіла дзяўчына. 7. А цяпер я думаю / Як жа добра і правільна, нават бездакорна ўсё склалася. Якое яно мудрае, жыццё... *(Т. Шымко)*. 8. Старажытны мудрэц павучае / Што заўсёды ў руху, тое

вечнае *(У. Ліпскі)*. 9. Напэўна, нядаўна маланка пацэліла, падпаліла / падумаў Базыль *(А. Якімовіч)*. 10. Больш нічога не гавары, хопіць... / папрасіла я *(Г. Васілеўская)*. 11. Ведаю я Маню Праневіч, але вучуся на іншым факультэце / прамовіла дзяўчына і дадала / Гэта толькі на кафедры могуць сказаць, у якой аўдыторыі яна цяпер *(Р. Баравікова)*. 12. Надыходзіць зіма... / прамовіў юнак, звяртаючыся немаведама да каго / Чарговы год пады ходзіць да лагічнага завяршэння *(С. Мацін)*. 13. Аліна павярнулася да Тані / Таня, ты запомніла адрас, па якім адвозіла чамадан *(А. Беланожка)*. 14. Лаўрэн Ігнатавіч / спытала незнаёмка / Я са школы мастацтваў. Мы паўгадзіны назад размаўлялі па тэлефоне *(І. Карэнда)*. 14. Я таксама рады / запэўніў Забаронак / Надзвычай рады. І за сябе, і за вас *(І. Клімянкоў)*. 15. Што за віна / папытаўся Сярожа *(В. Гардзей)*. 16. Заплакала маці. Ён абняў яе за плечы / Мама, не плач... Я ўсё зразумеў... *(Д. Пятровіч)*. 17. Ах, якое сёння неба зорнае / усклікнуў Валодзя *(Л. Левановіч)*. 18. Ах, час, час / задуменна вымавіла я, калі разглядала свае дзіцячыя рэчы / Як павольна ты цягнешся ў дзяцінстве і хутка ляціш у дарослым жыцці *(Т. Дземідовіч)*. 19. Ноччу будзе мароз / запэўніў Сяргей Сталетнік, выйшаўшы разам з усімі *(У. Гніламедаў)*. 20. Яшчэ пяць хвілін – і паварочваем назад / умольна зірнула на брата Юля і крыкнула / Бачу наперадзе лес *(Я. Конеў)*. 21. Сынаў адказ быў заўсёдным і лаканічным / Неяк пражыву! *(Ю. Зарэцкая)*. 22. Дзік! / міжволі падумалася хлопцу / Хутчэй за ўсё, дзік! *(Г. Аўласенка)*. 23. Не пашчасціла сёння. Так бывае. Але надзея ёсць, а без яе не варта на раку выбірацца / развважаў рыбак *(М. Бусько)*. 24. Ну нашто табе / скажуць мне гэтак / у чужое жытло заглядаць? *(М. Кулеш)*. 25. Усім патрэбна ўвага. І бярозе таксама / падумалася жанчыне *(У. Цішуроў)*. 26. Раскажыце цікавае пра партызан / папрасіла дзяўчына. 27. А цяпер я думаю / Як жа добра і правільна, нават бездакорна ўсё склалася. Якое яно мудрае, жыццё... *(Т. Шымко)*. 28. Старажытны мудрэц павучае / Што заўсёды ў руху, тое вечнае *(У. Ліпскі)*. 29. Напэўна, нядаўна маланка пацэліла, падпаліла / падумаў Базыль *(А. Якімовіч)*.

***4. Выпішыце сказ, у якім чужая мова аформлена няправільна. Расстаўце знакі прыпынку і складзіце схему.***

1)“Ён мог бы славай грымець сярод годных паэтаў Еўропы”, - пісаў пра Багрыма Уладзімір Караткевіч.

2) Англійскі літаратуразнавец А. Манмілін піша пра Янку Купалу, што: “…цяжка прадбачыць тыя часы, калі беларусы перастануць з любоўю песціць яго імя”.

3) Ірландскі вучоны Дэві зазначыў некалі, што кожны народ “павінен аберагаць сваю мову больш, чым граніцы, бо мова – гэта галоўная яго абарона, куды больш моцная, чым усе цытадэлі”.

4) На працягу месяца, як абяцаюць сіноптыкі, будзе цёплае надвор’е.

***5.Спішыце тэкст, расстаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.***

Дарога ў неба

Неглюбскія ручнікі ўсё роўна што слуцкія паясы. З адной толькі розніцай апошнія захаваліся фрагментарна, першыя ва ўсёй красе наіўнай даўніны. Еду ў Ветку з надзеяй на знакаміты музей. На шырокай лесвіцы музея мяне сустракае Ларыса Раманава, вядучы навуковы супрацоўнік і зазначае. У Неглюбцы гавораць што ручнік гэта дарога ў неба. Варта толькі паглядзець на арнамент. Знатакі сцвярджаюць што ў ім зашыфравана мова зносін з вышэйшымі сіламі.

На «музейным» аўтамабілі слізгочам па ўезджанай снежнай дарозе ў аграгарадок Неглюбку. Ручнікі вытканыя па мясцовых традыцыях напоўнены арнаментальнымі знакамі самым старажытным з якіх некалькі тысяч гадоў мая спадарожніца Ларыса Раманава дастае з сумкі старажытнае палатно якое вязе «расшыфроўваць» у Неглюбку. Як бярвенне было асноўным будаўнічым матэрыялам хаты так і ручнікі з'яўляліся своеасаблівым будаўнічым матэрыялам унутранай прасторы хаты і духоўнай прасторы сям'і. Сапраўдных майстрых захавальніц вясковага рамяства ў Неглюбцы яшчэ можна адшукаць.

Соф'я Астапенка сустракае нас ля варот. Праходзьце. Кросны яшчэ не ставіла. Але сяду з дня на дзень. Душа просіць шчыра прызнаецца яна. А ў пакоі погляд адразу гіпнатызуе сапраўднае чырвоны кут з іконай прыбранай ручнікамі. І сярод іх неглюбскі з тысячы адрозніш. З маці яго ткалі, калі мне гадоў 12 было. Выцвіў трошкі берагу.Ахвотна нам выкладвае сваё багацце дзецям і ўнукам наткала.

Я ўжо мала чаго памятаю з матчыных слоў якія знакі ды аб чым хавае пад хустку сівыя пасмы гэта ўжо пажылая жанчына Але без абраза і ручнікоў дом для мяне безабаронны атрымліваецца пусты. А ручнік дзетка жывы гэта ж дарога да неба і вяртанне з яго.

*Паводле В. Дралюк*

# ЛІТАРАТУРА

Асноўная

1. Беларуская мова. У 2 ч. Ч.1.: Падручнік / Я.М. Адамовіч, Л.А. Акаловіч, Г.Ф. Андарала і інш.: Пад агул.рэд. Л.М.Грыгор'евай. – Мн.: Выш.шк., 2001. – 318с.
2. Беларуская мова. У 2 ч. Ч. 2.: Падручнік / Я.М. Адамовіч, Н.И. Бурака, Л.М. Грыгор'ева інш.: Пад агул.рэд. Л.М. Грыгор'евай. – Мн.: Выш.шк., 2001. – 222 с.

Дадатковая

1. Антанюк, Л.А. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне : вучэб. дапам. / Л.А. Антанюк. Мінск, 2003.
2. Каўрус, А.А. Да свайго слова. Пытанні культуры / А.А. Каўрус; пад агул. рэд. У.І. Куліковіча. Мінск, 2011.
3. Куліковіч, У.І. Правілы сучаснай беларускай арфаграфіі: вучэб. дапам. / У.І. Куліковіч. Мінск, 2011.
4. Культура маўлення: зборнік практыкаванняў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт". Мазыр, 2005.
5. Марозава, Я.Н. Марфалогія : вучэбна-метадычны дапам. / Я.Н. Марозава. Віцебск, 2005.
6. Плотнікаў, Б.А. Фанетыка і марфалогія беларускай мовы : вучэб. дапам. / Б.А. Плотнікаў. Мінск, 2000.
7. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мн.: Нац.цэнтр прававой інфарм. Рэсп.Беларусь, 2008. – с. 68 – 144 с.
8. Сцяцко, П.У. Культура мовы / П.У. Сцяцко. Мінск, 2002.
9. Шакун, Л.М. Карані роднай мовы / Л.М. Шакун. Мінск, 2001.
10. Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. Мінск, 2004.

Слоўнікі

1. Арашонкава, Г.У. Кароткі слоўнік беларускай мовы. Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. Мінск, 1994.
2. Баханькоў, Л.Я. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / Л.Я. Баханькоў, І.М. Гайдукевіч, П.П. Шуба. Мінск, 2006.
3. Беларуска-рускі слоўнік: у 2 т. / пад рэд. К.К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). Мінск, 1988; 1989.
4. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А.М. Булыка. Мінск, 1999.
5. Гамеза, Л.М. Комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы: сінонімы, антонімы, паронімы, амонімы / Л.М. Гамеза. Мінск, 2008.

6. Гаўрош, П.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н.В. Гаўрош. Мінск, 1998.

7. Грабчыкаў, С.М. Беларуска-рускі слоўнік / С.М. Грабчыкаў. 4-е выд. Мінск, 1993.

8. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. 2-е выд., выпраўл. і дап. Мінск, 1993.

9. Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. Мінск, 1993.

10. Лобан, М.П. Арфаграфічны слоўнік / М.П. Лобан, М.Р. Суднік. 6-е выд. перапрац. і дап. Мінск, 1990.

11. Санько, З.Ф. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем / З.Ф. Санько. Мінск, 1991.

12. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі; І.М. Бунчук [і інш.]; пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. Мінск, 2005.

13. Шкраба, І.Р. Самабытнае слова. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І.Р. Шкраба. Мінск, 1994.

14. Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікау / П.П. Шуба. Мінск, 1993.

15. Слоўнік беларускай мовы: Цяжкасці правапісу, вымаўлення, акцэнтуацыі, словазмянення / склад.: Л.А. Ламека, У.Б. Ламека. Мінск, 2000.

16. Киселев, И.А. Русско-белорусский фразеологический словарь / И.А. Киселев. Минск, 1994.

17. Русско-белорусский словарь: в 3 т. / под ред. К.К. Атраховича (Кандрата Крапивы). Минск, 1994.

Вучэбнае выданне

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА: СІНТАКСІС

Метадычныя рэкамендацыі
да практычных заняткаў

Складальнік
**КРЫЦКАЯ** Наталля Віктараўна

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп'ютарны дызайн *Л.І. Ячмянёва*

Падпісана ў друк . Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 3,02. Ул.-выд. арк. 2,44. Тыраж . Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.